Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Аляксей Грыцук ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 29 (2671) Год LII | Беласток, 22 ліпеня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Купалле, Залукі, гміна Гарадок

Ёсць такая вёска ў Гарадоцкай гміне, дзе дзейнічаюць аж тры беларускія фальклорныя калектывы — уславіла на пачатку Купальночкі сакратар гміны Ліля Варакса вёску Залукі, якая зноў, пры дамамозе войта, Гарадоцкага цэнтра культуры (цяпер так афіцыйна завецца Дом культуры імя Кастуся Каліноўскага ў Гарадку, раней і „ГОК" — Гмінны асяродак культуры) ды таго Згуртавання „Залукі над Супраслю", у якім з'ядналіся актыўныя маладыя і пажылыя вяскоўцы — сарганізавала ў суботу, 14 ліпеня, свята для ўсяе гміны. У гэты раз Купалле, і са шкадаваннем гавораць пра наступнае, якое штогод рыхтавалі раней — гмінныя дажынкі, якія цяпер хоча зрабіць у сябе гмінная сталіца — 509-гадовы Гарадок. Там і месца больш, і даехаць выгадней, чым у адлеглыя ад яго на 9 кіламетраў Залукі.

Яднае залучан перш за ўсё школа — сапраўдны цэнтр культуры, на якой падворку стаіць і адмысловая сцэна, прыгожая, абсаджаная кветкамі, умацаваная каменным насцілам, пад дахам. За сцэнай і перад ёю — вялікая прастора, дзе проста лёгка душы, радасна сэрцу. Таму на святы, арганізаваныя ў Залуках, з'язджаецца так многа гледачоў, так многа прыязджае ў госці выступоўцаў з іншых гмін і мястэчак ды вёсак. Пасля, вядома, бываюць рэвізіты: гміна дае транспарт і вядомыя залучанскія „Каліна", „Калінка" і „Калінячка" ды гарадоцкія „Асенні ліст", „Расспяваны Гарадок", „Хутар" або нават і рок-гурты „РІМА" ці „5сот5" паказваюць свае дасягненні на шырэйшым форуме. Сёння ў Залукі прыехалі госці з Чорнай-Беластоцкай, Студзянак, „Арляне" з Орлі, „Журавінкі" з Агароднічак, дзеці з Генрыкова. Прыгожа станцавалі і заспявалі дзеткі з Гарадоцкага цэнтра культуры і вясковай святліцы ў Залуках (праз тыдзень прыедзе сюды былы прэм'ер-міністр Ежы Бузэк, і малечы з не меншым палам выступяць і перад ім). Свята агню, вады, сонца, месяца, урадлівасці і кахання ў Гарадоцкай гміне адгулялі належным чынам, пры рытуальных спевах, з вянкамі, пушчанымі на плынь Супраслі (што калісь панесла славуты манаскі крыж з-пад гарадоцкага замка Хадкевічаў аж у Супрасль, дзе быў заснаваны манастыр). Успаміналі і сёння ў гміне як даўным даўно квітнелі тут гандаль і культура, рассылаючы праменне не адно на сваю ваколіцу, а на ўсю Русь і Славяншчыну, і ваярства было змагарнае, чые сляды засталіся — ад Хадкевічаў, студзеньскіх паўстанцаў, партызан апошняй вайны. А змагаліся тутэйшыя людзі і словам — ад руплівых перапісчыкаў і складальнікаў царкоўных кніг, праз нашаніўцаў меляшкоўскага „Каршуна" — Янука Дарашкевіча ды „Арла" — гарадоцкага Сцяпана Пятэльскага, страшаўскага Аляксея Карпюка, і цяперашніх аўтараў з „Калосся" — Ніны Цыванюк, Анатоля Парэмбскага, старэнькай Надзеі Дудзік, Кастуся Казлоўскага, Янкі Федзюкевіча, Янкі Грыцука... Аж да карэспандэнтаў „Гарадоцкіх навін" — гміннай газеты, якую намогся заснаваць Лёнік Тарасэвіч. Сюды пішуць і вучні, і настаўнікі, сціплыя рупліўцы культуры, змагары за тое, каб Гарадок быў сучасным і светлым месцам, дзе жывецца добра. Тут жа ж непадалёк з Мастаўлян паходзіў апошні кіраўнік „паўстання на Літве" Кастусь Каліноўскі, які выдаваў першую газету па-беларуску „Мужыцкую праўду". Было і ёсць чым пахваліцца, а і пагараваць-панаракаць варта разам, бо ж і тутэйшы бок не абмінаюць польскія ці еўрапейскія вятры. А залучане могуць паказаць, што варта змагацца разам — як яны заўпарціліся не здаць свае школы, згуртавацца, абуўшыся не ў адны фальклорныя лапцікі на лепшую дарогу. Бо не варта аглядацца адно на нейкія іншыя арганізацыі, плакацца ў чужыя рукавы, як нас абмінае фартуна і іншыя грабуць да сябе ды прысабечваюць нашы дасягненні. Купалле сарганізавалі без лішніх „шапак" і прамоў. Расслаўляе штогод гміну ад 1989 года і Фестываль музыкі маладой Беларусі „Басовішча" — адна з найбольшых рок-імпрэз у Польшчы, што праводзіцца ў ліпені, і жнівеньская „Сяброўская бяседа" — міжнародныя польска-беларускія культурныя сустрэчы, і агульнапольскія сустрэчы абрадавых калектываў (пачатак мая), і гміныя дажынкі, і Свята Гарадка. Асабліва вакол жанчын круціцца ўсё жыццё, вакол гурткоў вясковых гаспадынь — гэта залучанскія разам з Валянцінай Паплаўскай, гарадоцкія — з Міраславай Антановіч, з Агратурыстычнага згуратавання „Агракрэсы" — з Вяславай Трусевіч, з Таварыства сяброў Гарадоцкай зямлі — з Аннай Грыцук.

Гарадоцкая гміна запрашае. Не толькі павесяліцца, але і інвеставаць, засноўваць малыя і сярэднія прадпрыемствы. Бо зямлі і аб'ектаў хопіць. Гэта грунты ў Баброўніках (пры краёвай дарозе Е-65) у суседстве пагранперахода, участак з прызначэннем на турыстычныя паслугі з гатэлем ды гастраноміяй пры заліве ў Зарэчанах, будаўнічыя ўчасткі ў суседстве заліву, нерухомасці ў Гарадку і Валілах-Станцыі пасля былога Гміннага кааператыва (будынак рэстарана, скупкі жывёл, склады), будынкі былых школ у Меляшках і Мастаўлянах.

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Жыццё на халяву ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Рух грамадскага транспарту ў Гродне адладжаны нераўнамерна і недастаткова зручна. Часта, стоячы на прыпынку ў чаканні патрэбнай маршруткі, назіраю адну карцінку. Пад'язджае бусік, у якім ёсць толькі некалькі вольных месцаў. І тут з-за плячэй тых, хто чакаў машыну досыць доўга, без чаргі выскокваюць некалькі асоб і шчэмяцца ў салон. Што цікава, як правіла, гэта пераважна маладыя дзяўчаты і жанчыны. На гэты конт і прымаўка ёсць у народзе адпаведная: „Нахабства — другое шчасце". Наўрад ці яны хочуць задумвацца, што дасягаюць свайго інтарэсу коштам іншых...

Беларушчына ў Вугоршчыне ☞ 2

Віталь ЛУБА

Штогоднік „Annus Albaruthenicus = Год беларускі" — плён „Беларускіх трылогаў", ладжаных аб'яднаннем „Віла Сакратас", выйшаў ужо восьмы раз. Нумар на 2007 год адкрываюць артыкулы, у якіх у гістарычна-сацыялагічным плане разглядаюцца асаблівасці беларускага нацыянальнага руху. Напрыклад, Юры Вашкевіч разглядае праявы і прычыны неакамуністычных і таталітарных тэндэнцый у беларускім грамадстве, выцякаючых з феномену савецкасці, савецкага чалавека...

Культура ў Чаромсе ☞ 4

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Размова з дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Чаромсе Барбарай КУЗУБ-САМАСЮК.

— Якія найважнейшыя ў гадавым вымярэнні мерапрыемствы праводзіць Ваш асяродак?

— У другой палове студзеня ладзім экуменічны Вечар калядак. Прымае ў ім удзел каля пятнаццаці калектываў з нашай гміны і адзін запрошаны госць звонку; у розныя гады былі гэта, напрыклад, выканаўцы з Арэшкава, Боцькаў, Беластока.

У маі-чэрвені, недзе каля Божага цела, адбываюцца ў нас тыднёвыя Міжнародныя сустрэчы з народным мастацтвам „З вясковага панадворка". На гэтае мерапрыемства штогод запрашаем гасцей з розных краін Еўропы: Балгарыі, Славакіі, Славеніі, Беларусі, Украіны, Латвіі, Францыі...

9 770546 196000

Жыццё на халяву

Рух грамадскага транспарту ў Гродне адладжаны нераўнамерна і недастаткова зручна. Часта, стоячы на прыпынку ў чаканні патрэбнай маршруткі, назіраю адну карцінку. Пад'язджае бусік, у якім ёсць толькі некалькі вольных месцаў. І тут з-за плячэй тых, хто чакаў машыну досыць доўга, без чаргі выскокваюць некалькі асоб і шчэмяцца ў салон. Што цікава, як правіла, гэта пераважна маладыя дзяўчаты і жанчыны. На гэты конт і прымаўка ёсць у народзе адпаведная: „Нахабства — другое шчасце". Наўрад ці яны хочуць задумвацца, што дасягаюць свайго інтарэсу коштам іншых. Прыклад, можа, і досыць дробны. Можна сказаць, што ўсё залежыць ад агульнай культуры кожнага канкрэтнага чалавека, ягонага выхавання ў сям'і. Але савецкая і постсавецкая сістэма доўгія гады пад фальшывым покрывам еднасці і братэрства, ахвярнасці і альтруізму, культывавала ў людзей спажывецкую псіхалогію. Ухапіць на халяву, праскочыць па-за чаргой, урваць хоць чаго хутчэй і паболей — на халяву ж і воцат салодкі — для нашага чалавека адзін з наймацнейшых інстынктаў. Што тут казаць, калі сам кіраўнік дзяржавы неяк публічна заклікаў скрасці вытворчыя тэхналогіі (канкрэтна ў швачнай справе).

Многія людзі часта хочуць дасягаць сваіх мэтаў мінімальнымі высілкамі і часам, як кажуць, на дурніцу. У кожнага канкрэтнага суб'екта „халява" праходзіць з той ці іншай перыядычнасцю. Але яна ніколі не можа доўжыцца бясконца. У кожнай сферы рана ці позна даводзіцца падмацоўваць свае прэтэнзіі на нешта адпаведным зместам і канкрэтнай працай — каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці.

Так і з цяперашняй беларускай эканомікай. Шырока дэкларараваны гаспадарчы „скок тыгра" ўсё больш падаецца папяровым. Тэлевізійныя і газетныя паведамленні з палёў і заводаў многім абрыдлі як горкая цыбуліна. Не трэба быць вялікім эканамістам, каб зразумець, што беларуская эканоміка апошніх дванаццаць год развівалася пераважна экстэнсіўнымі, камандна-адміністрацыйнымі метадамі. Такія падыходы даюць вынік толькі пэўны перыяд. Асноўны грунт адноснай стабільнасці айчыннай „народнай гаспадаркі" — гэта халяўна-танныя газ і нафта, якія Беларусь атрымлівала да гэтага года з Расіі. На перапродажы іншым краінам энергетычна-паліўнай сыравіны можна было добра зарабляць. Але пасля пераднавагодняга канфлікту паміж „братнімі" ўрадамі сітуацыя пачала істотна мяняцца ў горшы бок. І што з таго, што ідэалагічныя камісары „рынкавага сацыялізму" з Міністэрства статыстыкі і аналізу зараз цвердзяць пра рост унутранага валавога прадукту на 8,6 працэнта. Негатыўныя змены ў эканоміцы цяпер заўважаюць не толькі спецыялісты, прафесіяналы ў гаспадарчай галіне, але і звычайныя людзі. Адчуваюць гэта яны на сваёй скуры. На прадпрыемствах знікаюць прэміяльныя, у школах у настаўнікаў забіраюць аплачваемыя раней гадзіны, пенсіянераў пазбаўляюць ільгот, на мытні строга фіксуюць колькасць пераездаў бутлегерамі мяжы на машыне (ой, увядуць ім, напэўна, неўзабаве падатак!), на граніцах прыкрылі крамы вольнага гандлю — так званыя „шопы", дзе людзі куплялі танныя цыгарэты і алкаголь (дзяржава настойліва хоча „здымаць" з гэтых крамаў большы працэнт). На афіцыйнай камуфляжнай мове ўсе гэтыя працэсы звыкла называюць „упарадкаваннем". Але нішто так не прачышчае мазгі чалавеку як уласныя страты. Кошты на многія жыццёвыя рэчы (прыкладам, прадукты харчавання) няўхільна растуць. Беларусь па многіх паказчыках становіцца адной з даражэйшых краін Еўропы.

Пазбаўленне Беларусі заходніх гаспадарчых прэферэнцый зноў жа б'е па дабрабыце. Дзяржаўны пратэкцыянізм у Беларусі набыў абсурдны характар. Краіне надзвычай патрэбны інвестыцыйныя праекты, прычым добра, каб яны прыходзілі з розных краін свету. Гэта важна найперш для энергетычнай і іншай бяспекі краіны. Ці разумеюць там, „наверсе", што халява скончылася? Канешне, разумеюць. Але ці прыслухаюцца здаровага сэнсу — вялікае пытанне.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Беларушчына ў Вугоршчыне

Штогоднік „Annus Albaruthenicus = Год беларускі" — плён „Беларускіх трыялогаў", ладжаных аб'яднаннем „Віла Сакратас", выйшаў ужо восьмы раз. Нумар на 2007 год адкрываюць артыкулы, у якіх у гістарычна-сацыялагічным плане разглядаюцца асаблівасці беларускага нацыянальнага руху. Напрыклад, Юры Вашкевіч разглядае праявы і прычыны неакамуністычных і таталітарных тэндэнцый у беларускім грамадстве, выцякаючых з феномену савецкасці, савецкага чалавека; Аляксандр Смалянчук піша пра дамінанту этнакультурнага варыянта ў беларускай нацыянальнай ідэі пачатку XX стагоддзя; а Павел Церашковіч засяродзіўся на прычынах адставання нацыянальнай мабілізацыі беларусаў у параўнанні з суседнімі народамі. Паралелі ў нацыянальным развіцці беларускага і чэшскага народаў прыводзяцца ў артыкулах польскіх і чэшскіх даследчыкаў. Рышард Радзік з Любіна піша пра цывілізацыйна-культурныя ўмовы нацыястваральнага працэсу на фоне Цэнтральна-Усходняй Еўропы, якія былі карыснымі для чэхаў і некарыснымі для беларусаў. Чэшскія даследчыкі ў сваю чаргу звярнулі ўвагу на беларуска-чэшскія аналогіі. Міраслаў Грох спрабуе высветліць спецыфіку малапаспяховага беларускага нацыянальнага руху ў параўнанні з больш паспяховым чэшскім рухам, а Мілаш Жэзнік на прыкладзе падабенстваў і розніц паміж абодвума нацыянальнымі рухамі праводзіць агляд нацыяствараль ных працэсаў у Еўропе мінулага стагоддзя.

Пытанні пашырэння ведаў пра сучасную Беларусь у свеце, а канкрэтна ў Швецыі, закранаюцца ў нарысе Матыяса Новака і Мі Ленгаг. Аўтары сцвярджаюць, што шведскае грамадства пра Беларусь ведае нямнога, а журналісты апісваюць яе як „апошнюю дыктатуру Еўропы", засяроджваючыся на палітычным клімаце беларускай дзяржавы. Прытым адсутнічае аналіз гістарычных і культурных працэсаў, якіх веданне дапамагло б лепшаму зразуменню сённяшняй Беларусі. Аўтары падкрэсліваюць рост зацікаўлення праблематыкай Беларусі як навуковага свету (напрыклад, працы праф. Барбары Торнквіст-Плевы ці д-ра Андрэя Катлярчука), так і значнай часткі шведскага грамадства, у выніку чаго ўзніклі няўрадавыя арганізацыі, якія ўспамагаюць беларускую апазіцыю, вядуць харытатыўную дзейнасць, займаюцца прапагандаваннем беларускай культуры і літаратуры.

Асноўнай мэтай згаданага выдання з'яўляецца папулярызацыя беларускай культуры сярод еўрапейскіх грамадстваў. У сёлетнім нумары акцэнт пастаўлены на прыбліжэнне беларускай паэзіі венгерскаму чытачу. У раздзеле „Беларушчына ў Вугоршчыне" пасля ўводнага артыкула Лаяша Палфалві даюцца пераклады на венгерскую мову вершаў шырокага спектра паэтаў (ад класікаў да літаратараў маладога пакалення), у тым ліку і нашых „белавежцаў": Надзеі Артымовіч, Яна Чыквіна, Уладзіміра Гайдука, Зосі Сачко і Віктара Шведа. Творы нашых літаратараў апынуліся таксама ў падборцы перакладаў Алены Таболіч на англійскую мову (Віктар Швед, Яша Бурш, Алесь Барскі, Ян Чыквін, Юрка Геніюш, Зося Сачко, Юры Баена і Міра Лукша). Алена Таболіч таксама на англійскую мову пераклала апавяданне Евы Сцепанюк „Дзірка ў неба" („A hole into the sky"), якое ўпершыню друкавалася ў „Ніве" ў мінулым годзе і фрагменты кніжкі Сакрата Яновіча „Не жаль перажытага" („No regret"), выдадзенай Літаб'яднаннем „Белавежа" ў 2002 годзе.

У навейшым нумары штогодніка беларускія чытачы знойдуць пераклады Якуба Лапаткі з іспанскай (Мігэль Эрнандэс, Рафаэль Альберці), ірландскай (Томас Мур, Джозэф Планкет) і цыганскай (Вальдко Калініно) паэзіі ды Валерыя Буйвала з латышскай (Карліс Скалбэ) і кубінскай (Алеха Карпенцер) прозы.

Штогоднік „Annus Albaruthenicus = Год беларускі" — выданне шматмоўнае і таму пад артыкуламі даюцца кароткія рэзюме на беларускай, польскай або рускай мовах. Даступнае яно таксама ў Інтэрнэце па адрасе http://kamunikat.net.iig.pl/pdf/annus/annus2007.pdf.

Віталь ЛУБА

Вачыма еўрапейца

Добрае і благое вымярэнне

Я гатоў даць сабе руку адцяць, што немалая грамада палякаў не мае ніякай уявы пра тое, што дзеецца ў шмат якіх краінах свету. Ну, хай мне хто з іх скажа, напрыклад, якая сітуацыя ў Манголіі і чым жыве гэтая краіна. Апошнія інфармацыі — да таго сціплыя — паходзілі з перыяду распаду СССР і набыцця самастойнасці г.зв. спадарожнічаючымі краінамі, у тым ліку і краінай са сталіцай ва Улан-Батары. Не ўспомню тут аб іншых краінах Азіі ці Афрыкі. Дарэчы, гэты апошні кантынент — у мяне такое ўражанне — можа, апрача ПАР, трактуецца як свайго роду адна краіна, у якой пануе СНІД ды іншыя хваробы, нэндза ды голад. Нават аб такім Судане (Усходняя Афрыка) ужо ў Польшчы медыі забылі, хоць вынікі ўзаемных забойстваў адчувае гэтая краіна да сённяшняга дня. Успамінаю якраз аб Судане, паколькі прысніўся мне нядаўна знаёмы суданец, які штудзіраваў у Беластоку медыцыну, а заадно быў „лялькай" аднаго з гуртоў дыска-пола. Нейкія пяць гадоў таму з'ехаў ён у сваю краіну, каб спаткацца з даўно нябачанай сям'ёй. Меў ён праз пару тыдняў вярнуцца ў Беласток. Не вярнуўся. Жыве? Я хацеў бы прынамсі даведацца, што ў яго краіне адбываецца. Найбольшыя польскія медыі аб Судане, аднак, маўчаць. Такіх краін можна пералічваць значна больш. Каб далёка не шукаць, а застацца толькі ў Еўропе, ёсць такія краіны, аб якіх што-колечы гаворыцца адно пры нагодзе выбараў, скандалаў, тэрактаў і іншых жорсткіх падзей. Толькі што ўжо менш аб Чэхіі ці Славаччыне, а перш за ўсё аб Нямеччыне ці Расіі ды да таго на працягу якіхсьці двух гадоў галоўным чынам у кантэксце іх варожых намераў і дзеянняў у адносінах да Польшчы. Яшчэ горш з Беларуссю. Калі што-небудзь „праб'ецца", дык адно пра тое, што мае благі кантэкст. А то вось пра пераслед апазіцыі, або — як пару дзён таму — пра разбіццё быццам шпіёнскай сеткі, дзейнічаючай у карысць Польшчы, а то пра разбурэнне помнікаў у Гродне, а то пра тое... Думаю, аднак, што як і з чалавекам, усё мае добры і кепскі бок. Штосьці на той Беларусі мусіць быць добрае і прыгожае, у гэтай Беларусі, што жыве пад дыктатам Аляксандра Лукашэнкі.

Прыпомнілася мне гэта, калі я на мінулым тыдні ў адной з найбольшых варшаўскіх штодзённак прачытаў артыкул, прысвечаны фестывалю „Славянкі базар" у Віцебску, ператвораным калісьці з Фестываля польскай песні. Сёлета, падобна як і за апошнія 12 гадоў, асабіста патранаваў яму прэзідэнт Лукашэнка. Як штогод прымалі ў ім удзел таксама палякі з Польшчы: у конкурсе 19-гадовы Себастыян Плявінскі, вядомы з тэлеперадачы „Шанц на поспех", а ў журы засядала Крыстына Гіжоўская, вядомая сваім выкананнем м.інш. песні „Nie było ciebie tyle lat". У згаданым артыкуле журналіст усімі спосабамі спрабуе даць доказ тэзісу, што і малады Плявінскі, як і мастацка спелая спявачка з журы сваёй прысутнасцю на „Славянскім базары" апраўдваюць рэжым. Крыстына Гіжоўская прабуе тлумачыцца:

— Я не адчуваю, каб гэта было прапагандысцкае мерапрыемства.

Так ці іначай, таксама і віцебскі фестываль набраў у Польшчы благога вымярэння. І ўрэшце цяжка гэтае вымярэнне знайсці ў Беларусі, калі нават у такую шляхетную ідэю, як прамоцыя маладых спявацкіх талентаў, урываецца палітычная прапаганда.

А так пры нагодзе „Славянскага базара", ужо пры ўладзе Лукашэнкі выступілі на ім таксама папулярныя сёння польскія спевакі такія як Мечыслаў Шчэсьняк ці Анна Марыя Ёпэк, і што больш, гэты факт фіксуюць яны ў сваіх інтэрнэтных біяграфіях.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беласток вучыўся ў Семяноўцы

Дзеткі і моладзь з беластоцкіх школ, якія ходзяць на заняткі беларускай мовы, з 8 па 14 ліпеня ўдала гулялі і адпачывалі ў Семяноўцы на IV Летніх этнаграфічных майстар-класах „Я нарадзіўся тут". Маладыя людзі задаволены былі заняткамі ў Зялёнай школе, распаложанай побач Семяноўскага вадасховішча, а таксама захапляліся выездамі па наваколлі, у час якіх знаёміліся з мінулым і сённяшнім жыццём Нараўчанскай зямлі.

Моладзі дапамагала настаўніца Аліна Ваўранюк

— Мы вырашылі, што ў час летнікаў будзем знаёміцца з жыццём у паасобных нашых гмінах. Адпачывалі мы ўжо ў Белавежы, Такарах, Сацах, Ягуштове, а цяпер наведваем Семяноўку, каб пазнаёміцца з гісторыяй наваколля, прыродай і мясцовымі людзьмі. Упершыню разам адпачываюць дзеткі з падставовай школы і гімназічная ды ліцэйская моладзь, — сказала настаўніца беларускай мовы Аліна Ваўранюк, якая з дапамогай бацькоў і апекуноў наглядала за адпачынкам. Зялёная школа — перароблена з зачыненай Падставовай школы ў Семяноўцы, была нядаўна здадзеная ў карыстанне і таму ў ёй добрыя ўмовы для пабыўкі большых груп. 45 вучняў размешчаных было ў невялікіх пакоях, а заняткі адбываліся ў дзвюх канферэнц-залах. Калі я прыехаў у Семяноўку, дзеткі пад наглядам Кацярыны Бяляўскай з Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы пачыналі ткаць.

— Я паказваю дзеткам тканне самым простым спосабам — крыжыкам, а рамкі замяшчаюць нам кросны, — гаварыла Кацярына Бяляўская.

— Мне спадабалася вышыўка. Цікавымі былі таксама фільмы і гульні, — заяўляе Дар'я Дажынка. Дзеткі палюбілі ранейшыя дыдактычныя гульні. Паказваліся таксама сцэнкі, была праца з беларускімі крыжаванкамі.

— Ладзім мы летнікі, каб пазнаёміць нашых вучняў з багаццем культуры Беласточчыны. Вучні маюць нагоду пачуць жывую беларускую мову і пацікавіцца заняткамі, якія адыходзяць у забыццё. Можам таксама займацца тым, на што мала часу адводзім на ўроках беларускай мовы. Гэта добрая нагода для знаёмства з народнымі песнямі, мясцовымі абрадамі, легендамі, архітэктурай і традыцыяй, — тлумачыць настаўніца Аліна Ваўранюк. — Вучні інтэгруюцца, а меншыя дзеткі вучацца самастойнасці і сужыцця ў групе.

У час маёй пабыўкі ў Семяноўцы старэйшыя вучні, пасля кароткага інструктажу працаўніцы Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы Нэлі Харкевіч, рабілі пад яе наглядам кветкі з тонкай каляровай паперы. Выконвалі яны прыгожыя ружы, півоні і касачы, якіх у мінулым рабілі найчасцей перад Вялікаднем, каб упрыгожыць хаты. Раней дзяўчаты і хлопцы паспрабавалі вышываць з дапамогай апекуноў.

— У час нашага летніка можна цікава правесці час. У нас многа заняткаў і мы не нудзімся, — кажа Іаанна Хмялеўская.

— Нашы дочкі цэлы год чакаюць летніка, а мы ў сям'і так арганізуем вольны час, каб дзеці маглі пабываць на ім, — заяўляе маці дзвюх вучаніц і заадно апякун летніка Барбара Пякарская. — Тут непаўторная атмасфера, вучні мабілізуюцца да актыўнай працы і ў час заняткаў рэалізуецца таксама дыдактычны працэс.

Вучні мелі нагоду пазнаёміцца з навакольнай прыродай, якая ім спадабалася. Хаця побач месца іх жыхарства раскінулася вялікае вадасховішча, асабліва не захапляліся ім.

— Семяноўскае вадасховішча можна было збудаваць па-за вёскамі і не заліваць іх, — сказала Ганна Пякарская. — Мы хочам збіраць легенды і расказы пра Семяноўку і яе наваколле. Будзем звяртаць увагу на цікавых людзей.

Вучням спадабаліся старыя прылады працы, пабачаныя імі ў Юркі Баброўскага з Семяноўкі. Дазволіў ён вучням пакарыстацца цэпам, спрабаваць церці і трапаць лён.

— Мяне зацікавіла апрацоўка ільну, — заяўляе Лідзія Пякарская.

— Знаёмячыся з даўнімі прыладамі працы, можна пераканацца, якой цяжкай была праца на вёсцы ў мінулым, — кажа сяброўка Лідзіі — Ніна Ваўранюк.

Дзяўчаты звярталі ўвагу на дыялектную беларускую мову ў Семяноўцы, якая розніцца ад мовы іншых рэгіёнаў Беласточчыны і на вышываныя ручнікі, якія атаясамліваюцца ім з беларускасцю.

Калі ўзнікла АБ-БА — аб'яднанне бацькоў, дзеці якіх ходзяць на заняткі беларускай мовы ў Беластоку — яно стала ладзіць летнікі. Хаця рэалізацыя праекта фінансаваная была са сродкаў Маршалкоўскай управы, дапамагалі таксама гмінныя ўлады. Войт Нараўчанскай гміны даў аўтобус, на якім можна было перамяшчацца ў больш аддаленыя мясцовасці. Вучні ездзілі ў Грушкі, дзе ў Прыродазнаўчай зале і Гербарыі знаёміліся з мясцовай расліннасцю. Старэйшыя вучні ў час вячэрніх сустрэч прэзентавалі матэрыялы пра беларускіх пісьменнікаў — ураджэнцаў Нараўчанскай зямлі. Моладзь гаварыла пра Міраславу Лукшу, Уладзіміра Гайдука, Алеся Барскага і Янку Целушэцкага.

Малодшым дзеткам спадабалася тканне крыжыкам на рамках, якія замяшчалі кросны

— Мы расказвалі ўжо пра Тамару Саланевіч і вечарам знаёмімся з яе фільмамі, — гаворыць Аліна Ваўранюк. — Вучні былі таксама ў Галерэі імя Тамары Саланевіч у Нараўцы і бачылі хату, у якой яна жыла. Хочам яшчэ паехаць да Уладзіміра Гайдука. Запланаваны таксама выезд у Ляўкоўскую цагельню і заняткі з глінай, якія адбудуцца ў вясковай святліцы.

Моладзь была таксама на яўрэйскім могільніку.

— Вучні выконвалі на паперы адбіткі з мацэваў на яўрэйскім кіркуце ў Нараўцы, — паясняе Кацярына Бяляўская. — Ёсць нагода, каб маладыя людзі пазнаёміліся са шматкультурнасцю нашага рэгіёна.

Вучні паспрабавалі зняць фільм пра свой побыт у Семяноўцы.

Дапамагалі ім працаўнікі Беластоцкага тэлебачання — журналіст Мікола Ваўранюк і аператар тэлекамеры Раман Васілюк.

— Мы на фільме хацелі паказаць як праводзім час на летніку. Рабілі мы яго ў нашым стылі і з гумарам, — паведамляе Іаанна Хмялеўская. — Хадзілі мы па вёсцы і прасілі жыхароў Семяноўкі выступіць перад тэлекамерай.

У Семяноўцы былі вучні, якія ўжо чацвёрты раз прыехалі на летнік. Яны ўмелі размаўляць са старэйшымі людзьмі і ўмела збіралі інфармацыю. Ад іх вучыліся малодшыя сябры.

— У нас незвычайная настаўніца, пані Аліна Ваўранюк, якая нават бегае з намі па лесе, — заявіла яе вучаніца Ганна.

Побыт у Семяноўцы меў закончыцца выступленнем вучняў перад іх бацькамі. Дзеткі і моладзь пад наглядам апякункі Наталлі Жук з Мінска падрыхтавалі супольнае выступленне.

— Мы будзем прадстаўляць русальны абрад, які знік ужо з вясковага фальклору. Паглядзеўшы сучасныя фільмы, мы ўяўляем сабе русалак як істот з доўгімі хвастамі. У павер'ях былі гэта прыгожыя дзяўчаты, — кажа Наталля Жук. — Вучні рыхтуюць супольнае выступленне з аповедамі і песнямі, у якім пазнаёмім з народнымі павер'ямі пра русалак.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Дэмакратыя перамагла

Жыхары Гайнаўскага павета з прыемнасцю ўспрынялі вестку аб тым, што 21 чэрвеня Гарадская рада Гайнаўкі прыняла пастанову аб увядзенні беларускай мовы ў якасці дапаможнай у кантактах з чыноўнікамі. У сучасным свеце так быць павінна, паколькі Гайнаўка — гэта горад, у якім пераважаюць грамадзяне беларускага паходжання. Вакол Гайнаўкі таксама раскінуты вялікія беларускія вёскі.

Вышэй названая пастанова падыме нацыянальную годнасць мясцовых беларусаў, умацуе прэстыжнасць беларускага ліцэя. Да гэтага часу шмат хто з гайнавян не ўсведамляў сваёй беларускасці і саромеўся гаварыць па-свойму.

Раней у дзяржаўнай установе пабеларуску ніхто не сказаў ні слова, бо чыноўнікі не хацелі разумець беларускую мову. Апошнім часам сітуацыя змянілася на лепшае. Адкрытую беларускую гаворку можна пачуць у многіх гайнаўскіх крамах і некаторых установах, на гарадскім рынку і на вуліцах.

Дэмакратыя адкрыла вочы людзям і перамагла большасцю галасоў у гайнаўскай радзе. Пара і вясковым самаўрадам Гайнаўшчыны прыняць афіцыйныя пастановы аб статусе беларускай мовы ў гмінах, дзе большасць насельніцтва складаюць беларусы.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

„Pogranicze" на Слонімшчыне

У канцы траўня ў Слоніме адбыўся III Рэспубліканскі фестываль сямейнай творчасці „Жывіце ў радасці". На гэты фестываль быў запрошаны і ансамбль „Пагранічча" з Шыплішак Сувальскага павета. Выступленне гасцей так спадабалася слонімцам, што яны зноў запрасілі ў госці да сябе гэты цікавы ка-

лектыў, які спявае і танцуе польскія народныя песні і танцы.

І вось на днях калектыў з Шыплішак прыехаў у Слонім. Артысты з Сувальшчыны выступілі перад жыхарамі Жыровічаў, Слоніма, іншых беларускіх мястэчак. А ў мінулую нядзелю гэты калектыў прыняў удзел у свяце вёскі Драпава. На „біс" тут выступілі госці з Польшчы, мясцовы люд ад іх выступлення быў вельмі задаволены. У падарунак мясцоваму сельскавытворчаму кааператыву „Драпава" артысты падаравалі альбом пра Сувальшчыну, а гаспадары за гэта, і вядома ж за выступленне, накрылі ім багаты стол.

Калектыў „Пагранічча" не толькі дае свае канцэрты, але і знаёміцца з культурным жыццём Гродзеншчыны. Госці пабывалі на экскурсіі ў Жыровіцкім манастыры, у Навагрудскім музеі Адама Міцкевіча, а таксама наведалі Гродна.

Сяргей ЧЫГРЫН

Культура ў Чаромсе

Размова з дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Чаромсе Барбарай КУЗУБ-САМАСЮК.

— Якія найважнейшыя ў гадавым вымярэнні мерапрыемствы праводзіць Ваш асяродак?

— У другой палове студзеня ладзім экуменічны Вечар калядак. Прымае ў ім удзел каля пятнаццаці калектываў з нашай гміны і адзін запрошаны госць звонку; у розныя гады былі гэта, напрыклад, выканаўцы з Арэшкава, Боцькаў, Беластока.

У маі-чэрвені, недзе каля Божага цела, адбываюцца ў нас тыднёвыя Міжнародныя сустрэчы з народным мастацтвам „З вясковага панадворка". На гэтае мерапрыемства штогод запрашаем гасцей з розных краін Еўропы: Балгарыі, Славакіі, Славеніі, Беларусі, Украіны, Латвіі, Францыі... У той час адбываюцца не толькі канцэрты, але і майстар-класы па рукадзеллю, танцах, музыцы, прэзентацыі фільмаў і слайдаў, тэатральныя спектаклі. Сёлета была выстава плакатаў беластоцкага Драмтэатра, а абрадавыя спектаклі паказалі народныя выканаўцы з Украіны, Беларусі, Латвіі, Польшчы...

У канцы ліпеня адбываюцца ў нас Польска-ўкраінскія музычныя сустрэчы з удзелам фольклорных, народных і эстрадных ансамбляў з Польшчы і Украіны, ладжаныя Саюзам украінцаў.

У жніўні ладзім культурна-спартыўна-адпачынковы пікнік „Развітанне з летам". Раней былі гэта фэсты БГКТ, але ад двух гадоў ладзім іх самастойна. У час гэтага мерапрыемства адбываюцца спартыўныя спаборніцтвы і выступленні мясцовых мастацкіх калектываў.

У снежні арганізуем Сільвестар па-народнаму — грае „Чарамшына", адбываюцца народныя танцы, рыхтуюцца мясцовыя стравы.

— А якія пастаянныя заняткі праводзіць Ваш Гмінны асяродак культуры?

— Дзейнічае ў нас мастацка-рукадзельны гурток, якога заняткі адбываюцца пяць разоў у тыдзень — ад аўторка да суботы. Па аўторках і чацвяргах адбываюцца заняткі музычнага гуртка, у час якіх дзеці індывідуальна вучацца іграць на піяніна і акардэоне. Маладзёжны ансамбль духавых інструментаў займаецца, апрача індывідуальных практыкаванняў, двойчы ў тыдзень. Калектыў школьнікаў „Гілочка" займаецца з рознай частатой.

Да таго наша арганізацыя Саюза пенсіянераў ладзіць у нас свае імпрэзы. Гэта карнавальная забава, Дзень жанчын, Дзень маці, Дзень сеніёра ды „звычайныя" танцавальныя вечарыны. Ну і па некалькі экскурсій штогод...

Штогод ладзім некалькі майстар-класаў, м.інш. выплятання вырабаў з саломы, вязання кручком ды белага спеву. У мінулым годзе згаданыя вакальныя заняткі па адмысловай падачы голасу адбыліся тры разы. Сёлета прадбачваем заняткі па выплятанню саламяных вырабаў, у рамках якіх плануем этнаграфічную экскурсію дзеля дэталёвага азнаямлення з прыёмамі выплятання, пасля кожны з удзельнікаў выканае па адным вырабе з саломы і арэшнікавага лыка; гэтыя вырабы будуць паказаны на завяршальнай адмысловай выставе.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Дырэктар Гміннага асяродка культуры ў Чаромсе Барбара КУЗУБ-САМАСЮК

У сакавіку ладзім адборачныя кваліфікацыі да дэкламатарскага конкурсу „Baje, bajki, bajeczki"...

— Можа нешта скажаце пра мастацкія калектывы з Вашай гміны.

— Гэта „Чарамшына", „Гілочка" ды вакальныя калектывы: з вёскі Чаромха і „Вульчанкі" з Вулькі-Тэрахоўскай.

„Чарамшына" дзейнічае ўжо чатырнаццаць гадоў; зараз налічвае яна восем чалавек. За той час навелада яна Латвію, Германію, Францыю, Бельгію, Швецыю, Італію, Галандыю і, па сутнасці, усю Польшчу.

— А на ўсход: на Украіну, Беларусь, „Чарамшына" не ездзіла?

— Не прыйшлося ані разу. Было ішло на выезды і ў Беларусь, і на Украіну, але не даходзіла да іх.

Агулам „Чарамшына" дала каля 450 канцэртаў, у сярэднім па сорак у год. Бывала так, што давалі мы па два канцэрты ўдзень, напрыклад за час тыднёвага турнэ па Францыі далі мы чатырнаццаць канцэртаў; падобна было і ў Германіі.

У „Гілочцы" выступае каля дваццаці вучняў і гімназістаў з Чаромхі-Станцыі. Згаданыя вясковыя калектывы налічваюць па пяць старэйшых асоб, якія займаюцца па меры патрэб у вясковых святліцах або сваіх хатах.

— Якімі аб'ектамі распараджаецца Ваш асяродак?

— Гэта наш будынак з глядзельнай залай на 250 месцаў; яна можа змясціць усіх нашых вучняў. Побач будынка Асяродка ёсць эстрада для выступленняў на вольным паветры. Маем вясковыя святліцы ў Баброўцы, Вульцы-Тэрахоўскай, Кузаве, Чаромсе-Вёсцы, Ставішчах, Апацы-Вялікай і ў Чаромсе-Станцыі па вуліцы Фабрычнай.

— З якімі грамадскімі суб'ектамі супрацоўнічае Ваш асяродак?

— У першую чаргу са Згуртаваннем любіцеляў народнай культуры ў Чаромсе...

— У якім, як падазраваю, галоўная роля таксама за Вамі...

— Так; не ведаю, ці гэта добра, ці дрэнна, што ўсё ў адных руках. Згуртаванне вядзе некалькі праектаў, напр. выдавецка-архівізацыйны „Pieśni nie tylko święte. Tradycje muzyczne Podlasia", у рамках якога хочам ахапіць апекай шырокі дыяпазон народнай культуры, асабліва падляшскай. У супрацоўніцтве з Радыё Беласток запісалі мы і выпусцілі аўдыёкасеты з рэлігійнымі, пахавальнымі, абрадавымі, лірычнымі і сезоннымі песнямі. Пакуль запісалі мы тры такія касеты з калектывамі з Вулькі-Тэрахоўскай, Чаромхі-Вёскі і Дабрывады. Хацелася б зрабіць запісы на кампакт-дысках, але ж на ўсё патрэбны спонсары...

Яшчэ супрацоўнічаем, вядома, з Управай гміны, пачатковай школай, гімназіяй, дзіцячым садком, бібліятэкай, паліцыяй, пагранаховай, пажарнікамі, прафсаюзамі, чыгуначнікамі; дарэчы: у жніўні наша дэпо будзе адзначаць стогадовы юбілей.

— Вы згадалі пра спонсараў. Ці можаце назваць галоўных з іх?

— Апрача самаўрадавых Управы гміны, Павятовага староства і Маршалкоўскай управы здабываем іншых спонсараў пры нагодзе канцэртаў „Чарамшыны". Маем спонсараў з Варшавы, Беластока, Бельска-Падляшскага, Познані. На наш тэатральны праект атрымалі мы грошы з міжрэгіянальнага еўрасаюзнага фонду. Партал Wirtualna Polska за час фестывалю „З вясковага панадворка" прэзентаваў банэр з выхадам на наш сайт. Рэкламныя мігалкі выпускалі беластоцкія тэлеі радыёвяшчанне ды іншыя інтэрнэтавыя парталы.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Фэст у беларускай Чанстахове

(пачатак у 28 н-ры)

— Здравствуй, Люда! — да мяне падышоў незнаёмы і працягнуў руку. Дзядзька зблытаў мяне са сваячкай з Мінска. Ён паклікаў яшчэ жонку, якая, убачыўшы мяне, ад здзіўлення заківала галавой:

— Ну, точка ў точку, Люда!

Праз момант я адчувала сябе як персанаж бразільскага тэлесерыяла. Там, як вядома, раней ці пазней, знаходзяцца дзесьці-калісьці загубленыя блізняты.

Невыпадкова мае думкі кружылі вакол Бразіліі. Ля касцёла пачыналіся прывітанні пілігрымаў. Карціна жыва напамінала лацінаамерыканскія рэлігійныя сустрэчы з харызматычным ухілам. На хорах у выглядзе сцэны, пабудаваных побач алтара з мастацкай выявай Ісуса, па чарзе выступалі прадстаўнікі ад паасобных груп паломнікаў. Маладыя спевакі і музыканты — з электрычнымі гітарамі. Яны спявалі ды іграли жывыя рэлігійныя творы, пад гукі якіх хацелася танчыць. Па-беларуску, часам па-руску! Пасля кожага выступлення ў неба ішоў радасны гул — як на рок-канцэрце. Я засяродзілася, каб злавіць у кадр фотаапарата аголеныя пупікі танцорак з дрэдамі на галаве. Але маю ўвагу адцягнула дзяўчына са шчанём сенбернарскай пароды. Паломніца і яе сабака мелі на шыях такія самыя эмблемы — жоўтыя шарфы. Бо кожны горад быў тут пазначаны нейкім колерам. Мінск, на той прыклад, меў павязаныя на шыі жоўтыя шарфы, а Маладзечна трымала ў руках пластмасавыя кветкі сланечніка.

— Жыве Усявышні Бог!!! — заклікаў лідэр з хораў цераз мікрафон.

— Жыве!!! — грымела ў адказ грамада.

У час заклікаў над галовамі паломнікаў луналі тысячы разнаколерных хустак. Ніхто не хваляваўся надыходзячай бурай з маланкамі, якія здаваліся тут лазернымі бліскамі, высветленымі з нагоды фэсту.

* * *

Апрача лацінаамерыканскіх матываў уражвала яшчэ нечаканая перамена настрояў. Тыя радасныя пілігрымы, што танчылі ў дажджы, гадзіну раней, у скрусе і адданні прыйшлі на каленях (па камені) у кафедру, каб пакланіцца Іконе Божай Маці. Усярэдзіне пяяў найцудоўны жаночы хор, панавалі добрая ціш і засяроджанасць. Я прысела ў лаўцы са старэйшымі вернікамі і думала пра прамову ксяндза Завальнюка. У бок алтара непарыўным патокам паўзлі пілігрымы. Аб дах барочнай кафедры рытмічна бубніў дождж і чуліся водгукі грому.

Ксёндз Уладзіслаў гаварыў пра магутныя дубы, якія разам з пушчай шумелі пяцьсот гадоў таму на месцы сённяшняга Будслава. Менавіта з такога дуба быў зроблены крыж, які сёння прыплыў па рацэ. Гісторыя месца звязаная з высечкай лесу і плытагонствам. Магчыма, што гэты дуб выплыў адсюль у сталіцу Вялікага княства Літоўскага. (Касцёлы і цэрквы звычайна ўзводзіліся ў месцах святых гаёў!) Драўніна, з якой быў выкананы крыж, была вынята са старых муроў віленскага кляштара бернардзінцаў.

* * *

Дзесьці пад вечар я сустрэла сяброў, праўда, не гэтых, з якімі раней дамовілася ў Будславе. Пасля няшпораў разам з патокам пешаходаў мы рушылі ў бок лагера паломнікаў. Па дарозе мы ўспаміналі наша паломніцтва на Грабарку, дваццаць гадоў таму, яе сяброўскую атмасферу з бяседнымі песнямі на палатачным полі.

Здалёк будслаўскі лагер выглядаў як даўняе турэцкае мястэчка перад бітвай. У шарэнгах красаваліся вайсковыя палаткі. Найперш чулася тут руская мова і мясцовая трасянка, часам гучала беларуская. У адным канцы кампанія іграла „па-беларуску” ў валейбол.

— У нас не было такога як у іх размаху, — прыкмеціў сябра.

Якраз мы праходзілі ля аўтафуры загружанай спальнікамі і рукзакамі. Нечакана для саміх сябе мы пачулі і наш беластоцкі акцэнт. У адным куточку хлопцы і малады ксёндз танчылі пад беларускую музыку *disco-polo*. Мы слухалі і не маглі паверыць! З магнітафона ў машыне ляцела найперш „Як забава, забава, то до рання, до рання...”, а пасля катастрафічны шэдэўр „Ехалі казакі доламі, гарамі, прывязалі Галю да сасны касамі”....

— Адкуль вы ведаецце „Прымакоў”, — спытала я ўзрушаным голасам ксяндза.

— Нядаўна яны выступалі ў Мосары. І моцна спадабаліся!

Такім чынам мы пазнаёміліся з групай вясёлых паломнікаў з Мёраў.

* * *

Апоўначы пачалася працэсія. Пілігрымы з запаленымі свечкамі і багародзічнай малітвай акружылі вялікі парк. Працэсія доўжылася за газдіну і напамінала жывое кола.

Прыемна было палюбавацца сотняю ксяндзоў і манашак з беларускай малітвай на вуснах. Прыклад ішоў з самой гары. На беларускай мове маліліся ўсе ерархі: апостальскі нунцый у Беларусі арцыбіскуп Марцін Відавіч, епіскапы: мінска-магілёўскі Антоні Дзямянка, віцебскі — Уладзіслаў Блін, пінскі — Казімір Велікаселец...

Хацелася, каб сённяшні фэст пабачылі беларускія ксяндзы-адраджэнцы.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Хто задбае?

Вуліца Вішнёвая ў Чаромсе-Станцыі спалучае два салэцтвы: Кузаву і Ставішчы. Гэтай дарогай карыстаюцца як жыхары згаданых вёсак, так і многія чарамшане. Але не беспраблемна. У час праліўных дажджоў дарога ператвараецца ў пекла. У двух месцах (ад сядзібы Сяргея Саўчука па вуліцу Новую) робяцца такія гразкія лужыны, што пешшу прайсці ці нават аўтамабілям праехаць немагчыма. Ёсць і іншая загана, якая тычыцца згаданага месца. Адрэзак дарогі не асветлены. Гэта карыстальнікам стварае дадатковую небяспеку.

Часта прыходзіцца мне праязджаць вуліцай Вішнёвай. Ад нейкага часу прыкмячаю там разбіты бетонны слуп тэлефоннай лініі. Гэта не вынік урагану. Мабыць, нейкі асобень у нецвярозым стане не справіўся за рулём ды ўрэзаўся ў слуп. Але аб дарожна-транспартным здарэнні ніхто не загаварыў ды і гайнаўскія сувязісты не спяшаюцца замяніць слуп. Па сённяшні дзень вісіць ён на тэлефонным кабелі. Хто задбае, каб вуліца стала праезджай ды асветленай дарогай?

Разбіты слуп звісае на тэлефонным кабелі

Гмінная ўправа, папраўдзе, абяцае палажыць асфальтавае палатно пасля таго як будзе пракладзена каналізацыя. Але інвестыцыя залежная ад прыдбаных фінансавых сродкаў. А з гэтымі ўсяляк бывае. Пры нагодзе варта прыгадаць, што большасць чаромхаўскіх вулачак са жвіраваным насцілам патрабуе грунтоўнай падсыпкі. Такое прыкмячаецца на Прыдварцовай, Вонскатаровай і шмат іншых вуліцах у цэнтры пасёлка. Людзі плацяць падаходны і дарожны падаткі ды патрабуюць, па меры магчымасці, праезджых дарог. Гміна карыстаецца неабходнымі машынамі для гэтай справы. Але чыноўнікі выглядаюць з мора пагоды і спадзяюцца, што хтосьці за іх зробіць.

Тэкст і фота У. С.

Дарога цераз лес

Гравейка з Лешукоў да ваяводскай асфальтавай дарогі з Новага Ляўкова ў Бандары (у Нараўчанскай гміне) бяжыць цераз лес. Яна вузкая і зараз усё больш ухабістая. Ніхто не абкошвае яе, ніхто ад пару гадоў не карчуе кустоў у прыдарожных равах. Таму ехаць па гэтай гравейцы небяспечна. Але не толькі таму.

На скрыжаванні 3-кіламетровай лясной дарогі з ваяводскім трактам год таму яшчэ стаяў дарожны знак, які папярэджваў аб перакрыжаванні з галоўнай дарогай. Цяпер яго няма. Пра прызабытую лясную дарогу неабходна зараз жа паклапаціцца Праўленню павятовых дарог у Гайнаўцы, паколькі ездзіць па ёй шмат легкавых аўтамабіляў, трактароў і грузавікоў.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Семяноўскія чорцікі і русалкі ў тэлебачанні...

Ева Сегень, хоць ліцэістка, не можа ўявіць сабе канікулаў без беларускага летніка „Я нарадзіўся тут". А сёлета праходзіў ён на зямлі яе продкаў — у Семяноўцы. Магчыма таму страшнасмешная легенда пра чорціка нарадзілася па дарозе з яе радавога гнязда Семяноўшчына, калі моладзь цёмным лесам вярталася ў лагер.

— А ці ваш чорцік быў хоць чорны? — дапытваўся ўсё Браян Скот, цёмнаскуры журналіст з тэлеперадачы „Этнічныя кліматы". Кракаўскае тэлебачанне аж чатыры дні пабывала ў Семяноўцы. Сёлетні летнік адрозніваўся ад трох папярэдніх выпускаў журналісцка-тэлевізійным ухілам. Моладзь, пад кірункам журналістаў Беластоцкага тэлебачання, сама спрабавала здымаць фільмы пра Семяноўку і мясцовыя атракцыёны, пра саміх сябе і сваіх апекуноў. І зрабіла гэта з вялікай дозай гумару і аўтаіроніі. Менавіта такі ж гумарыстычны характар мелі ўсе віктарыны. А пік інтэлектуальнага ўзлёту моладзь праявіла ў час тэлетурніру на тэму літаратараў-„белавежцаў" Нараўчанскай зямлі. У першую чаргу пайшлі „Вершы тутэйшыя" Міры Лукшы. „Добраахвотнікі", назначаныя самой моладдзю, мелі за задачу разгадаць тутэйшых герояў, знайсці любімыя месцы паэткі або растлумачыць сакрэтны змест паэтычных фраз тыпу: *na plotkach — nie kotki, a wierszowane makotki"*

Таксама ў гумарыстычна-рэкламным фільме пра мясцовыя атракцыёны вядучы Тамаш Максімюк навёў карэктуру на прыжытыя ўяўленні. Найбольш інспіравала тут керамічнае прадпрыемства. Пабыўку на керамічнай фабрыцы Тамаш падводзіць рэкламным лозунгам: „Цэглу ў Ляўкове купляеш — дзяўчат зарываеш!" Сапраўды, фантазіі беластоцкім гімназістам маглі б пазайздросціць беластоцкія спецы па рэкламе (параўнай рэкламу ляўкоўскай цэглы на беластоцкіх аўтобусах: „Lewkowo — najlepsze polskie cegły z Podlasia").

Тэматычным працягам папярэдніх выпускаў летніка „Я нарадзіўся тут" была праца над этнапастаноўкай пра русальны абрад. Тут працавалі найперш малодшыя ўдзельнікі летніка. Яны развучылі русальныя песні і карагоды. Яны таксама хадзілі на вадасховішча шукаць русалак. Дарэчы, пра русалак з Семяноўскага вадасховішча пісала згаданая ўжо паэтка Міра Лукша.

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК ПІШУЦЦА САМЫЯ ЦУДОЎНЫЯ ВЕРШЫКІ...

Аднойчы самы звычайны хлопец Міхалка раптам адчуў, што як толькі ён праходзіць міма дзяўчынкі Тэрэзкі, — з ім адразу пачынае рабіцца нешта неверагоднае... І тое неверагоднае спачатку дабаўляе чырвонай фарбы ягоным бледным шчакам, потым ярка пунсавее юначае сэрца, і ўрэшце загараецца нязгасна-сарамлівым агнём уся ягоная бедная душанька. І захацелася Міхалку моцна-моцна пасябраваць з Тэрэзкай, прычым не толькі банальна пасябраваць, а дамагчыся прыязнай дзявочай прыхільнасці. А паколькі хлапчына дакладна ведаў (магчыма, ад старэйшых сябрукоў, а магчыма, з якіх меланхалічна-неўміручых раманаў эпохі Адраджэння), што самы дзейсны сродак у такіх сітуацыях — падараваць дзяўчыне прыгожы выкшталцоны вершык, дык не марудзячы сеў крамзоліць аркуш белай як снег паперы.

Але, але мае харошыя чытачыкі!.. Далей выкручастых, найбанальнейшых, крыху дурнаваценькіх крамзоляў — паэтычная справа Міхалкі так і не зрушылася. І прыйшоў ён да Тэрэзкі ды спыніўся перад ёю, сумна калупаючы жоўты пясочак сваім чаравікам ды баючыся падняць на яе свае бясконца самотныя вочы. Ды толькі і здолеў, што раптам дакрануцца да ейных танклява-прыгожых дзявочых пальчыкаў сваёй крыху дрыжачай рукой. І раптам... О, што здзеелася там раптам! Тэрэзка адказала яму, адказала сваім дотыкам, цёплым, даверлівым, незвычайным. І ў сарамліва-ўрачыстым танцы спляліся іхнія пальцы, і паліліся-пасыпаліся ў пераліўнае, смяшлівае наваколле самыя што ні ёсць паэтычныя радкі гэтай бясконца-светлай размовы, гэтай несканчальнай, ціхай гаманы дзвюх рук, двух лябедзікаў, двух радасных сэрцайкаў.

Так што не кажыце мне болей, што вы ані не ўмееце пісаць вершыкаў, прыгожых, лірычных вершаў; нават і слухаць не захачу!..

Ваш дзядзечка Сід
7 ліпеня 2007 г., Кобрын

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

Гардкор-2007 або Муха ціп-топ на канікулах

— 2 —

Усе ўдзельнікі лагера „Гардкор-2007” выйшлі са старэнькага, сіняга аўтобуса, які прывёз іх у Смальніцу.

— Куды мы прыехалі? — спыталася я ў кіраўніка летніка Генадзя Шакальскага.

— Куды трэба, туды і прыехалі. Скажу толькі адно — мы далёка ад Беластока. Спецыяльна выбралі такое дзікае і далёкае месца, каб вы не маглі ўцячы дахаты.

— А ці ёсць тут возера і крама? — спытаў нейкі хлопец.

— Вядома, ёсць! Толькі вам нельга туды хадзіць. Ха-ха-ха-ха-ха!

— Ну і *гардкор*, — прашаптала я на вуха Ганцы, — здаецца, мы маем справу з нейкім псіхам!

Шакальскі меў добры слых, пачуў мае словы. Ён падышоў да мяне, ухапіў за левае вушка, стаў ім тузаць аж зрабілася яно фіялетавае.

— Калі яшчэ раз адазвешся пра мяне ў такі спосаб, будзеш спаць у лесе. Я чалавек нядрэнны! У першы раз твая кара будзе лагоднай. Сёння будзеш начаваць на цёмным гарышчы. Разам з павукамі, мышамі, кажанамі і пацукамі. Сама! Ха-ха-ха-ха!

— Прашу прабачэння за мае словы, — я вырашыла ратаваць сваю скуру, — я так не думаю пра вас!

— Ты хіба здурэла? — крыкнуў Шакальскі. — На маім лагеры няма прабачэння!

Я глянула на сваіх сяброўак. Я баялася вымавіць слова, баялася, што яшчэ больш пашкоджу справе...

— А цяпер мы падзелімся на групы, — прапанаваў Шакальскі. — Першую групу будзе весці мая жонка, Марыетта Шакальская. Калі ласка, прывітайце яе бурнымі воплескамі.

З грамады выступіла худая, невысокая жанчына. Яна была касавокая і мела суровы выгляд твару.

— У маёй групе будуць усе хлопцы з гімназіі н-р 2, — аб'явіла суровым тонам жанчына. — Гэта: Філіп, Адам, Шымон, Давід ды адна дзяўчына з Гімназіі н-р 27, нейкая Ганка.

— Што? — наша сяброўка была злосная як аса. — Я маю быць сама ў групе з хлопцамі? Без сяброўак?

— Так, — крыва ўсміхнулася спадарыня Марыетта, — запрашаю, даражэнькая! Пайшлі ў нашу хату...

Мы з Касяй і Соняй былі ў шоку. Яны раздзялілі нас з Ганкай!

— Другой групай будзе кіраваць Яўген Ляскоўскі, — паінфармаваў нас шэф летніка.

Настаўнік фізкультуры выступіў з шарэнгі і стаў чытаць імёны сваіх падапечных. Да яго прыдзялілі ўсіх хлопцаў з Гімназіі н-р 10 ды Касю і Соню. Дзяўчаты на падкуленых ад жаху нагах ледзь дабрылі да групы Ляскоўскага. Хлопцы з іх дружыны выглядалі быццам бандыты і крымінальнікі.

— Апошня, мая група, — цягнуў Шакальскі, — будзе складацца з трох хлопцаў з Гімназіі н-р 15. І яшчэ дзве дзяўчыны — мая дачка Дарота і Бася Муха.

Я была задаволена саставам групы. Нашы хлопцы былі прыгожыя і ветлівыя. Нашу дружыну закватаравалі ў старой апусцелай хаце, без шыбы ў акне. Пасля Шакальскі забраў нашы мабільнікі.

— Вам трэба засяродзіцца на жыцці групы, — патлумачыў сваё рашэнне мужчына, — званкі да бацькоў і сяброў будуць толькі замінаць у такой важнай справе. Я не магу дазволіць, каб вы думалі пра глупствы. Тут неабходная ўвага і канцэнтраванасць. Вы павінны вярнуцца дадому ўжо іншымі людзьмі...

На вячэру нам падалі бутэрброды з арахісавым маслам змяшаным з гарчыцай. І малако, у якім плавалі агуркі. Фэ! Пасля Шакальскі завёў мяне на цёмнае гарышча, зачыніў на ключ дзверы і праз дзірку яхідна прашаптаў:

— Жадаю каляровых сноў!

Усю ноч па гарышчы ганяліся пацукі. Над маім ложкам вісела павуковая сець, у якой бзыкалі падрыхтаваныя да яды мухі. Упершую ноч летніка „Гардкор-2007” я не сплюшчыла вока.

Тэкст: natasza9922@wp.pl
Дызайн: lolcia05@tlen.pl

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Міхаліна Герасімюк — Гайнаўка

Матэуш Магрук — Бельск-Падляшскі

Польска-беларуская крыжаванка № 29



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 25:

Баль, буся, дар, ліфт, мір, міс, Лі, гурт, гарт, іва. Бант, бура, га, Ас, мур, ля, ліст, цір, мяцёлка.

Хмары над „горадам сонца”

Не першы месяц кіпяць жарсці вакол так званай „рэканструкцыі” Гродна. Падобна на тое, што ўлада не хоча лічыцца ні з навукоўцамі, ні з грамадскасцю. Сацыялістычны прынцып „дарэшты разбурым, а затым...” стаў галоўным падыходам у справе ператварэння Гродна ў „горад сонца”. Апошняй справай стала разбурэнне ходнікаў па цэнтральнай пешаходнай вуліцы — Савецкай. Старых тратуараў, папраўдзе, не шкада, але разам з іх даставаннем нішчацца дрэвы. Яны вырэзваюцца па ўсім Гродне з нейкай упартай маніякальнасцю. Некалі самы зялёны горад ператварыўся ў самы „лысы”. Маладыя саджанцы вырастуць яшчэ не скора, а цяпер у гарачае надвор’е пры ветры стаяць клубы пылу. Такое назіраецца і па ўсёй Гродзенскай вобласці.

Самае кепскае, што „рэканструкцыя” адбываецца з незразумелай хуткасцю, сумбурнай паспешлівасцю. А даведацца пра сутнасць работ часцей усяго можна толькі пастфактум, строга дазаваная інфармацыя час ад часу з’яўляецца толькі ў дзяржаўных газетах (іншыя ўжо даўно зачыненыя), належнага прафесійнага і грамадскага абмеркавання няма. Справа „рэканструкцыі” выразна паказала, што ўсё на мясцовым роўні вырашае выканаўчая ўлада, усе астатнія структуры з’яўляюцца толькі паслухмянымі прыдаткамі „вертыкалі”, якія мусяць слепа выконваць тое, што ім загадваюць. Пасля розных зваротаў і пад ціскам грамадскасці ўрэшце ўлады ў чэрвені правялі ва універсітэце „круглы стол”, на які не запрасілі навукоўцаў з крытычным поглядам на справу сённяшняй рэстаўрацыі Гродна. Некаторым удалося прарвацца на „закрытае мерапрыемства”, іншых гісторыкаў і журналістаў у залу папросту не пусцілі міліцыянты. Удзельнічалі ў гэтым пасяджэнні пераважна ідэалагічныя работнікі, а таксама некаторыя прылашчаныя пасадамі і працай гісторыкі, якія былі пакліканы „навукова” абгрунтоўваць варварскія дзеянні ўладаў. Да гонару некаторых гісторыкаў, якія яшчэ працуюць ва універсітэце, яны адважыліся на крытычныя словы. Але ў цэлым абмеркаванне мела выразна „заказны” і паказушны характар.

Куды цікавейшы і альтэрнатыўны круглы стол пад назвай „Каму выгадна руйнаванне Гародні” быў праведзены крыху пазней. Яго ініцыятарам выступіў гродзенскі рух „За свабоду”, а ўдзельнікамі сталі вядомыя гродзенскія гісторыкі, краязнаўцы, грамадскія дзеячы, незалежныя журналісты, архітэктары, жыхары старога мікрараёна „Новы свет”, які паводле задумаў улады амаль цалкам падлягае руйнаванню. Вынікам сустрэчы, якая сабрала паўсотні зацікаўленых, стала прыняцце заявы. Некаторыя цікавыя выказванні яго ўдзельнікаў падаем ніжэй.

За апошні час было разбурана некалькі адметных будынкаў, якія былі дарагія патрыётам горада. Прыкладам, будынак па вуліцы Горкага, пабудаваны ў стылі канструктывізму сто гадоў таму, доўгія гады ў ім месцілася крама „Гарачы хлеб”, досыць трывалы будынак старога млына каля заапарка. Галоўны архітэктар горада таварыш Анісімаў у інтэрв’ю адной з газет заявіў, што гэта не руйнаванне а „аднаўленне”. Маўляў, будынак млына купілі на аўкцыёне, цяпер ён разабраны, але будзе адбудаваны ў ранейшым выглядзе.

***Алесь Смалянчук**, доктар гістарычных навук: — Кожны канкрэтны будынак аднавіць можна, але ці можна вярнуць яго аўру?!*

Андрэй Вашкевіч і Алесь Смалянчук

Справай абароны Гродна ад бяздумнага руйнавання і перапланавання займаюцца пераважна маладыя людзі. І гэтая з’ява досыць станоўчая для беларускага грамадскага руху. Адраджэнне моладзевых ініцыятыў у Гродне, якія былі прыглушаныя гадоў пяць таму, адбываецца зараз якраз вакол абароны старога горада.

***Андрэй Вашкевіч**, гісторык: — Выбух грамадскай актыўнасці ўзрадаваў. Справа абароны Гродна выйшла за межы вузкага кола гісторыкаў.*

Апошнія месяцы маладых удзельнікаў пікетаў і флэш-мобаў у абарону Гродна сістэматычна затрымлівае міліцыя, іх палохаюць пакараннямі і выклікаюць на „прафілактычныя размовы” ў КДБ. Але моладзь працягвае бараніць свой горад, да яе далучаюцца актывісты, якія прыязджаюць з іншых мясцовасцей Беларусі.

Андрэй Вашкевіч на пасяджэнні расказаў пра этапы разбурэння Гродна яшчэ ў савецкі час. Тое, што адбываецца цяпер, гэта лагічны працяг чужынскай палітыкі знішчэння адметнасці горада над Нёманам. А з выказванняў прысутных архітэктараў і іншых спецыялістаў, якія працуюць на дзяржаўнай службе (па зразумелых прычынах не называем іх імёны) выразна вынікала, што, па-першае, у нас востра брак адмыслоўцаў, па-другое, шмат чаго залежыць ад прафесійнасці і найперш сумленнасці кожнага канкрэтнага архітэктара, адказнага за свой кавалак працы.

***Алесь Краўцэвіч**, доктар гістарычных навук: — Яшчэ ў савецкі час Беларусь была пазбаўлена нацыянальнага кінематографа і тэарэтычнай рэстаўрацыі. За часам кіравання Лукашэнкі яна была знішчана канчаткова. Так што цяпер няма практычных рэстаўратараў, бібліятэка інстытута рэстаўрацыі была папросту раскрадзена. А ў справе рэстаўрацыі няма нічога горшага, чым актыўныя дурні.*

Ці не найбольш дзідаў зламана хіба наконт вырашэння транспартнай праблемы. Больш-менш жыхароў задавальняе новы мост каля аўтавакзала, але практычна ўсе шафёры незадаволены развязкай, якая была зроблена пры ўездзе з цэнтра на стары мост. Галоўная перашкода руху — танк на высокім пастаменце — засталася, а раз’езд нават ускладніўся. Пытанне — ці варта было вынішчаць увесь сквер?

***Ігар Лапеха**, краязнавец: — На маю думку, дапушчана шмат памылак у транспартных развязках. Генеральны план горада патрабуе зусім іншага — прыкладам, зрабіць пешаходнымі вуліцу Карла Маркса, Савецкую плошчу і ўвогуле пазбавіць гістарычны цэнтр транзітнага транспарту шляхам фармавання наўкола яго малога транспартнага кальца. Калі б улады прытрымліваліся генеральнага плана, то зараз бы займаліся пабудовай эстакаднага моста на поўнач ад чыгуначнага вакзала ці працягам вуліцы Астроўскага.*

Насамрэч генеральнага плана ніхто паслядоўна не прытрымліваецца. Адсюль і ўражанне, што работы вядуцца па прынцыпе „што каму ў галаву прыйдзе”. Транспартны паток цяпер у цэнтры пушчаны зусім блізка ад каштоўных помнікаў архітэктуры, што стварае дадатковую пагрозу. Плынь аўтамашын каля замкаў і манастыра Раства Багародзіцы істотна ўзмацнілася. А праект перабудовы і пашырэння старога моста стане тупіковым. Гораду патрэбны яшчэ адзін новы мост, а не пашырэнне старога.

***Аляксандр Мілінкевіч**, грамадска-палітычны дзеяч: — Цяперашняя ўлада вельмі непісьменная, гэта людзі, якія адмежаваліся ад іншых сапраўднай сцяной. Пакуль няма сапраўдных выбараў, мы не паправім становішча. Гродна мае каштоўнасць найперш для беларусаў, трэба развіваць „настальгічны турызм”. З гэтага гледзішча знішчэнне, прыкладам, „Старога Свету” ёсць папросту абсурдным.*

Улада сапраўды даўно паставіла жалезабетонны мур для астатніх па ўсіх пытаннях жыцця горада. Аднак таксама на круглым стале прагучала цікавая думка пра тое, што нават пры гэтай сістэме існуе розніца паміж мясцовымі ўладамі розных гарадоў. Паводле задумаў „айцоў горада” Гродна неўзабаве мусіць ператварыцца ў турыстычны цэнтр. Нават пастаўлена канкрэтнае заданне для розных структур. Прыкладам, для мясцовага універсітэта — зарабіць за год на турызме пяць мільёнаў рублёў. Толькі як гэта зрабіць пры такой неразвітай інфраструктуры — калі няма гатэляў, адмысловых стаянак для аўтобусаў, месцаў харчавання. Няма выбару паштовак, інфармацыйных улётак і буклетаў. На пасяджэнні прагучаў цікавы прыклад. За адзін канкрэтны дзень у Полацк прыехалі 42 турыстычныя аўтобусы, а ў Гродна толькі 6. За апошнія гады ў Полацку паўстаў шэраг адметных скульптурных помнікаў — Еўфрасінні Полацкай, Сімяону Полацкаму, літары „Ў”, зараз у горадзе працуе 12 музеяў. А ў Гродне за дзесяць апошніх гадоў усталёўвалі толькі пампезныя манументы савецкаму ладу і, за выняткам памятнага каменя Давыду Гарадзенскаму, не з’явілася нічога нацыянальнага. Днямі, праўда, нечакана для многіх (бо інфармацыі не было) каля старога парку паставілі помнік яго заснавальніку — натуралісту Жану-Эмануілу Жыліберу. Можа цяпер у гэтым плане нешта зрушыцца.

А пакуль над „горадам сонца” ідзе зацяжны дождж і ходзяць хмары бяздумнай паспешлівай „рэканструкцыі”.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Родам з Беласточчыны

Аляксея Грыцука любілі ўсе

Пра Аляксея (Алеся) Грыцука хацеў я напісаць даўно, хаця гэта вельмі добра зрабіў Вячаслаў Харужы. У 2000 годзе ў „Беларускім гістарычным зборніку" (№ 13) ён апублікаваў на польскай мове цікавы артыкул „Aleksy Hrycuk (1910-1976)". І каб нешта дадаць новае пра нашага земляка, трэба было шукаць звесткі пра яго ў розных беларускіх эміграцыйных выданнях, шукаць тых людзей, якія яго ведалі і якія яшчэ жывуць, каб ад іх запісаць успаміны пра знакамітага беларуса з Беласточчыны.

Напісаў я ліст у Таронта Раісе Жук-Грышкевіч. На днях атрымаў адказ. Спадарыня Раіса напісала: „Паважаны спадар Сяргей! Сёння атрымала Ваш ліст і адразу яго прачытала жонцы Алеся Грыцука — Вользе, якая жыве ў Кінгстан. Яна паведаміла, што „Бацькаўшчына" ў Менску выдала ейную кнігу пра мужа Алеся Грыцука „Мы стваралі сваю Беларусь". „Там, — кажа, — ўсё ёсць", а таксама фотаздымкі. Яна Вам напіша. Дасылаю Вам свой артыкул на 30-я ўгодкі смерці Алеся Грыцука. Болей Вам нічога не змагу прыслаць, бо я цяжка хворая. Застаюся з найлепшымі пажаданнямі і пашанай — Раіса Жук-Грышкевіч. 18.06.2007".

Праз пару дзён з Мінска наша слынная пісьменніца Вольга Іпатава перадала мне кнігу Вольгі Грыцук пра жыццё і дзейнасць Аляксея Грыцука, тую кнігу, пра якую мне згадала ў лісце Раіса Жук-Грышкевіч. Менавіта Вольга Іпатава была ўкладальніцай і літаратурным рэдактарам гэтага цікавага выдання.

Аляксей (Алесь) Грыцук нарадзіўся ў вёсцы Міхнаўка Падляшскага ваяводства на Беласточчыне ў 1910 годзе. У сям'і яго бацькоў былі яшчэ тры браты і пяць сясцёр. Але нягледзячы на розныя матэрыяльныя цяжкасці, Аляксею ўдалося скончыць тады Варшаўскі універсітэт.

Калі пачалася ІІ сусветная вайна, ён прымаў удзел у абароне Варшавы, быў ранены, пасля трапіў у нямецкі палон. Адтуль уцёк і вярнуўся ў Ляўкова. Стаў кіраваць на Беласточчыне Школьным інспектаратам. „Стаўшы акруговым школьным інспектарам Беластоцкай акругі, Аляксей Грыцук прысвяціў гэтай справе ўсю сваю энергію, нягледзячы на супраціў з боку польскіх настаўнікаў. Сярод паплечнікаў яго былі Хведар Ільяшэвіч і Уладзімір Тамашчык, які пазней стаў епіскапам Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (БАПЦ) у Нью-Йорку Васілём", — згадвае ў кнізе Вольга Грыцук. У 1944 годзе Аляксей Грыцук выехаў на Захад, стаў асветным афіцэрам у Першым батальёне Беларускай краёвай абароны: выкладаў гісторыю для беларускіх вайскоўцаў. „Дарэчы, — згадвае Вольга Грыцук, — ягоны брат Коля таксама быў у Краёвай абароне, ён знік без вестак, будучы ў беларускім антыбальшавіцкім падполлі Родзькі-Гелды, і Аляксей вельмі цяжка перажываў гэтую страту".

Перад самым заканчэннем вайны спадар Грыцук трапіў у амерыканскі палон у Аўстрыі, але зноў адтуль уцёк і апынуўся ў Зальцбургу. Тут ён паспеў пазнаёміцца з украінскімі дзеячамі і наладзіў з імі супрацоўніцтва. А яны прынялі яго ў свае лагеры. Там ён аб'яднаў вакол сябе беларусаў і яны пачалі разам праводзіць сваё культурна-грамадскае жыццё, а таксама выдаваць часопіс „Пагоня" са старонкай „З беларускага жыцця". „Пагоні" выйшла чатыры нумары, а „З беларускага жыцця" — 37 нумароў. Рэдагавалі іх Аляксей Грыцук, Алесь Салавей і Уладзімір Дудзіцкі.

Аляксей Грыцук — настаўнік у Беластоку

Аляксей, Антон і Мікалай Грыцукі ў Ляўкове каля Нараўкі

У сваёй кнізе „Мы стваралі сваю Беларусь" Вольга Грыцук успамінае: „Быў Алесь мужны і бясстрашны чалавек, таму меў у лагеры вялікі аўтарытэт. Вось жа толькі адзін прыклад з тых часоў: у 1945-1946 гг., калі яшчэ не было ніякіх візаў на выезд з Аўстрыі ў іншыя краіны, ён хадзіў нелегальна цераз Альпы ў Нямеччыну, каб навязаць лучнасць з Радай БНР, якая ў той час знаходзілася ў Мюнхене. Кожны раз я моцна перажывала за яго, бо гэта было небяспечна і таму, што пераходзіць цераз гэтыя велічэзныя горы простаму чалавеку, не альпіністу, зусім няпроста, а яшчэ таму, што гэта было забаронена і наступствы маглі быць самыя цяжкія. Адтуль, з Нямеччыны, Алесь прыносіў розныя навіны і весткі аб адраджэнні беларускага жыцця, што для нас было вельмі важна".

У студзені 1948 года Аляксей Грыцук выехаў у Канаду. Яго ўзялі ў гэтую краіну па кантракце, які трэба было год адпрацаваць лесарубам. І Аляксей працаваў. Але разам з тым актыўна ўключыўся ў беларускія справы. У 1965-1967 і ў 1970-1972 гадах ён узначальваў Згуртаванне беларусаў Канады, шмат друкаваўся ў газеце „Беларускі эмігрант". Дарэчы, у кнігу Вольгі Грыцук увайшлі артыкулы, эсэ, урыўкі з дысертацыі Аляксея Грыцука. Ён марыў абараніць доктарскую дысертацыю па жыцці і творчасці Максіма Багдановіча. У кнізе друкуюцца ўрыўкі з дысертацыі, абарона якой не адбылася. Назвы артыкулаў гучаць так: „Максім Багдановіч і станаўленне сучаснай беларускай літаратуры", „Французскі сімвалізм і паэзія Максіма Багдановіча".

Беларускія настаўнікі Беласточчыны. А. Грыцук трэці злева ў першым радзе. 1943 г.

Пра што яшчэ думаў тады і пісаў наш зямляк? Гартаю кнігу і чытаю ягоныя цікавыя матэрыялы, якія ён друкаваў у беларускім эміграцыйным друку. Гэта артыкулы пра Крэва, Гародля, Вялікае княства Літоўскае, пра Цётку, якая „праклала далейшы шлях для развіцця беларускай літаратурнай мовы", пра Францішка Скарыну, які „не толькі ўславіўся як першы друкар ва Усходняй Еўропе, але і як вялікі вучоны тагачаснасці. Ён быў наскрозь прасякнуты ідэямі гуманізму і пашыраў іх на сваёй Бацькаўшчыне, Беларусі. Слава яго выйшла далёка па-за межы Беларусі". Напісаў і пакінуў нашчадкам Аляксей Грыцук і сур'ёзнае даследаванне „Беларусь у XXII стагоддзях". Даследаваў на эміграцыі наш зямляк і беларускі друк у Канадзе. Ён адзначае, што „на працягу дваццацігадовага існавання беларуская эміграцыя не стварыла вялікага спісу надрукаваных працаў і для тлумачэння гэтага існуюць дзве прычыны. 1. Зусім нямногія з інтэлектуалаў абіраюць Канаду сталым месцам жыцця і 2. Вельмі абмежаваныя грашовыя рэсурсы".

Сапраўды, Канада была не лепшым месцам для адукаваных эмігрантаў у 1948 годзе, асабліва для тых, хто меў гуманітарную адукацыю. Таму некаторыя з іх праз пэўны час эміграваліі ў ЗША. А тым, хто застаўся, давялося змагацца за працу, забываючы адукацыю і падрыхтоўку. Як згадваў Аляксей Грыцук, усведамляючы гэта, беларусы Канады звычайна злучалі свае намаганні з беларусамі ў ЗША.

Цікавым дакументам, які надрукаваны ў кнізе, з'яўляецца „Рэляцыя Алеся Грыцука, кіраўніка Галоўнага школьнага інспектарату па Беластоцкай акрузе ў 1943-1944 гг.". Дарэчы, яна друкавалася ў „Беларускім гістарычным зборніку" (рыхтаваў Вячаслаў Харужы) у 1999 годзе (№ 11). „Да 1943 года існавала на Беласточчыне прыблізна 20 школаў. 95 школаў пачало працу ў верасні 1943 года. У канцы траўня 1944 года канчала школьны год каля 115 школаў з 140 настаўнікамі. Галоўны школьны інспектарат не быў у сілах пакрыць усе запатрабаванні на адкрыццё новых школаў з прычыны браку людзей. Я не ведаю, якія раёны абнімае цяперашні Сакольскі павет, але там школы не было. Там справа пагоршылася, калі Міхась Васілёк перайшоў у партызаны. Адтуль была заява на школу ў 1944 годзе, але не было настаўніка", — згадвае Аляксей Грыцук.

Жывучы ў Канадзе, наш зямляк ведаў, апроч роднай мовы, рускую, нямецкую, польскую, украінскую, французскую і англійскую. Аднойчы ў пошуках лепшай працы ён прыехаў у горад Кінгстан, дзе ў мясцовым Універсітэце Куінз яму прапанавалі добрую працу. А ў 1966 годзе сюды ён перавёз усю сваю сям'ю. Працуючы ва універсітэце і маючы нядрэнны заробак, у 1970 годзе Грыцукі пабудавалі ў Кінгстане сабе новы дом і справілі наваселле. Хто толькі тут не пабываў! працяг ☞ 10



http://belradio.fm

Усе беларускія СМІ — гэта нібыта медыі дзвюх недружалюбных адна да адной краін. Дарма, што распавядаюць яны пра падзеі ў адной і той жа дзяржаве. Да такога стану прывёў існуючы ментальна-палітычны падзел краіны. Хтосьці хоча бачыць яе ў мінулым, гэта значыць, часткай Савецкага Саюза, а іншыя імкнуцца ў Еўропу. Адной з праяў такога імкнення можна лічыць „Еўрапейскае радыё для Беларусі", якое робяць невядомыя беларускія журналісты.

Чуюць гэтае радыё далёка не ўсе. Праўда, для таго, каб яго пачуць, дастаткова мець на сваім камп'ютэры адпаведныя функцыі, якія дазваляюць слухаць аўдыёверсіі навін, якія транслюцца на Брэст і Пінск з Украіны, а таксама па „Балтыйскіх хвалях".

Паколькі данае радыё лягчэй за ўсё знайсці ў Інтэрнэце, то пераключым сваю ўвагу на яго сайт. Месціцца ён па адрасе http://belradio.fm і вельмі падобны на звычайны сайт з навіннымі паведамленнямі. Галоўным адрозненнем з'яўляюцца выйсці на разнастайныя фарматы праслухоўвання аўдыёверсій.

Уласна „Еўрапеўскае радыё для Беларусі" існуе ўжо амаль два гады. На жаль, заўважыць нейкага больш-менш актыўнага праматвання гэтага радыё-інтэрнэт рэсурса не ўдалося. З чаго паўстае пытанне: можа варта стваральнікам радыё неяк паактыўней весці сябе не толькі ў віртуальнай, але і ў рэальнай прасторы, рэкламуючы свой партал?

Што ж тычыцца партала, то ён выглядае вельмі няблага. Размешчанае на шэрым фоне выяўленне зверху аздоблена лагатыпам радыё і выйсцямі на рубрыкі. Не будзем доўга затрымлівацца на першай старонцы, бо там як мае быць знаходзіцца стужка навін, а звернемся да наступнай, якая называецца „Пра нас". Гэтая старонка яшчэ адзін прыклад найсціплейшага стаўлення да сябе і сваёй віртуальнай працы, якое чамусьці ўласцівае многім беларускім інтэрнэт-парталам. „Мы існуем з 2005 года, — распавядаюць пра сябе стваральнікі „Еўрапейскага радыё". — Мы распаўсюджваем праўдзівую і актуальную інфармацыю пра падзеі ў Беларусі і за яе межамі. Мы — за свабоду і аб'ектыўнасць. Мы незалежныя беларускія журналісты. Мы адкрытыя да новага і паважаем традыцыі". Аніводнага прозвішча, аніводнага больш-менш падрабязнага расповеду пра праект і пра калектыў, што працуе для гэтага радыё, мы не знойдзем. Не зусім зразумела, чаму архіў навін вядзецца толькі з пачатку ліпеня гэтага года, калі радыё існуе ўжо не першы год. Праўда, што тычыцца ўласна апошніх навін, то да гонару „еўрапейскіх" радыйшчыкаў, абнаўляюцца яны рэгулярна.

Скантактавацца з рэдакцыяй магчыма толькі праз электронную пошту — звычайны ліст даслаць няма куды, як, дарэчы, і пазваніць — нумароў тэлефонаў гэтага радыё не пазначана нідзе.

„Еўрапейскае радыё для Беларусі" прадастаўляе магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі свайго сайта на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай.

Адной са станоўчых асаблівасцей сайта з'яўляецца структураванне жанраў і галін віртуальнага эфіру. Рубрыкі, якія ідуць далей, падзяляюцца на „Навіны", „Рэпартажы", „Музыка", „Конкурсы і прызы" і іншае.

Цікавай асаблівасцю партала з'яўляецца тэст, які прапануецца прайсці віртуальнаму вандроўніку. Называецца ён „Тэст на беларускасць". Шчыра кажучы, адказаць на ўсе яго пытанні мне, напрыклад, не ўдалося.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Усё як заўсёды

Як звычайна ў ліпені пачынаецца еўрапейскі кубкавы сезон. Беларускія каманды ўжо даўно не хапаюць у розыгрышах кантынентальных кубкаў зорак і змушаны граць ролю статыстаў. Не стаў сенсацыяй у гэтым сэнсе і ўдзел салігорскага „Шахцёра" ў Кубку Інтэртота. Першы бар'ер у выглядзе армянскага „Арарата", які пры бліжэйшым разглядзе падаўся не гарой, а маленькім пагоркам, адзін з мацнейшых айчынных клубаў з горам папалам прайшоў. У Салігорску нябесныя свяцілы сапраўды ззялі для беларусаў — 4:1, а на выездзе нашы ледзь утрымалі агульную перавагу — 0:2. Ну а другі раунд стаў неадольным. Сустрэчы з адэскім „Чарнаморцам" — серадняком украінскага футбола — выразна паказалі розніцу ў класе паміж нашымі клубамі і прадстаўнікамі нацыянальнага чэмпіянату паўднёвых суседзяў. У першым матчы, які праходзіў у Адэсе, салігорцы, хоць і саступілі, але чапляліся за пазітыўны зыход. У выніку 2:4, якія давалі беларускаму прадстаўніку невялікія сумарныя шанцы. Далейшая рэчаіснасць, аднак, сталася горкай — 0:2 на сваім полі і развітанне з турнірам. Айчынным заўзятарам можна далей перажываць за „Чарнаморац", у складзе якога прапісаныя ажно тры беларускія футбалісты. Акрамя гэтага цэлы месяц ішлі размовы пра пераезд у Адэсу з „Гомеля" мацнейшага айчыннага галеадора Рамана Васілюка, але трансфер пакуль так і не адбыўся. Калі развіваць тэму далей, то варта сказаць, што чарговы ўкраінскі чэмпіянат стартаваў толькі што, а ў заяўках клубаў прозвішчы 18 беларускіх гульцоў. Яшчэ адной „нашай" камандай можна лічыць львоўскія „Карпаты", куды ў летняе кароткае міжсезонне перабраўся абаронца салігорскага „Шахцёра" і беларускай зборнай Аляксандр Юрэвіч. Там ён складзе кампанію суайчыннікам Аляксею Сучкову і Леаніду Ковелю. Апошні вельмі моцна правёў канцоўку мінулага першынства і лічыцца адным з найбольш перспектыўных беларускіх форвардаў. Тры беларусы таксама і ў запарожскім „Металургу" — Арцём Чалядзінскі, Мікалай Кашэўскі і Ян Цігараў. Усе яны былі кандыдатамі ў нацыянальную зборную.

Не навявае аптымізму і блізкі старт у еўракубках іншых беларускіх дэлегатаў. Хіба што толькі барысаўскі БАТЭ здольны прайсці два кваліфікацыйныя раунды Лігі чэмпіёнаў. У першым спаборы ён зыдзецца з кіпрскім „Апаэлем". У разе поспеху барысаўцы далей сустрэнуцца з фарэрцамі ці ісландцамі — расклад абсалютна спрыяльны. А два дынамаўскія клубы — з Мінска і Брэста ў Кубку УЕФА будуць змагацца з прадстаўнікамі Латвіі — адпаведна з рыжскім „Сконта" і ліепайскім „Металургам". Абедзве дынамаўскія дружыны апошнім часам дэманструюць зусім бляклую гульню, а еўрапейскі момант ісціны выявіць ці здольныя яны на нешта сур'ёзнае.

Тым часам нацыянальны чэмпіянат у вышэйшай лізе мінуў экватар. Адрыў БАТЭ за апошні час вырас да дыскрэдытуючага першынства. Барысаўцы пасля першага круга маюць 33 пункты, далей ідуць мінскі МТЗ — 25 ачкоў, „Гомель" — 24, гродзенскі „Нёман" — 23. Ну а „Шахцёр", прадказальна не вытрымаўшы змагання на два франты (як амаль заўсёды ў нас бывае), адкаціўся ў сярэдзіну турнірнай табліцы. Будзем сачыць як еўрапейскія баталіі паўплываюць на стан чэмпіёна краіны БАТЭ.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

9 ☞працяг

У іх гасцілі Жук-Грышкевічы, Вітаўт Тумаш, Наталля Арсеннева, Рагулі, Сурвілы, Сажычы, Ганькі, Касцюкевічы, Пашкевічы, ды амаль усе прадстаўнікі беларускай эміграцыі ў Канадзе і ў ЗША.

З 1951 года Аляксей Грыцук быў то скарбнікам, то сябрам, а то і старшынёй сектара Рады БНР у Канадзе. Вельмі часта выступаў на розных навуковых канферэнцыях, сустрэчах, фестывалях, секцыях. Найперш гэтыя выступленні былі звязаныя з гісторыяй Беларусі, яе знакамітымі людзьмі і датамі. Ён шмат з кім перапісваўся. Некаторыя пісьмы да Аляксея Грыцука і яго лісты апублікаваныя ў кнізе. Гэта лісты ад Алеся Салаўя, Янкі Юхнаўца, Янкі Станкевіча, Міколы Абрамчыка, Сяргея Хмары, Янкі Запрудніка, Кастуся Мерляка і іншых беларускіх дзеячаў на эміграцыі.

Аляксей Грыцук пражыў 66 гадоў, яго не стала 30 траўня 1976 года. Кніга жонкі Вольгі Грыцук „Мы стваралі сваю Беларусь" — гэта спроба аднавіць памяць пра нашага слыннага суайчынніка. У кнізе надрукаваны і ўспаміны пра Аляксея Грыцука. Вось некаторыя вытрымкі з гэтых успамінаў.

Аляксей Грыцук у Канадзе, 1975 г.

Івонка Сурвіла: „Алесь Грыцук ад самага пачатку выгнання ўзяўся за працу. Яшчэ ў Аўстрыі здабыў сабе і адначасна Беларусі мноства прыяцеляў. Атрымлівалася гэта ў яго лёгка. Вечная ўсмешка, ветлівасць, энтузіязм — прыцягвалі як магніт".

Яўген Кабатц: „Дзядзька Алёша — гэта выключная постаць у маёй памяці. Памятаю вакацыі 1943 года ў Нараўцы. Дзядзька Алёша быў спакойны, калі з'явіўся немец з планам ліквідацыі вёскі Плянта, да якой быў прыпісаны дзедаў двор. Дзядзька Алёша адразу растлумачыў немцу, што тэрыторыя, на якой знаходзіцца дом, гэта не вёска Плянта, а толькі пасёлак Плянта — гэта частка за чыгуначнымі пуцямі, што, на шчасце, была адзначана на карце. Немец скрупулёзна праверыў, развітаўся і сышоў, адчуваючы пад пахамі прыемныя формы бутэлек з самагонам".

Марыя Ганько: „Аляксея любілі ўсе. Ён быў сапраўдным рухавіком усіх працэсаў, якія адбываліся ў самыя першыя гады ў Згуртаванні беларусаў Канады".

Барыс Аляксандраў: „Аптымізм і ветлівасць, любоў да ўсяго прыгожага — былі прыкметнымі ўласцівасцямі гэтага вечнага эпікурэйца. Ад яго болей, чымся з кніжак, даведваліся мы пра непараўнаных паэтаў-рамантыкаў Максіма Багдановіча, Наталлю Арсенневу, Масея Сяднёва, Максіма Танка. Былі ў яго ўлюбёныя паэты і ўлюбёная паэзія, якую ён часта дэкламаваў".

Раіса Жук-Грышкевіч: „Алесь Грыцук — прыстойны, ветлівы, зраўнаважаны інтэлігент. Цяжка ўявіць сабе, каб ён калі каголечы не толькі скрыўдзіў, але нават каб зрабіў словам ці ўчынкам камусь прыкрасць... У грамадскім жыцці падчас гарачых дыскусій ён ніколі не падымаў голасу. Любіў Алесь прыгаство, і Бог надарыў яго прыгожай жонкай Вольгай і дачкой Юльянай".

Сёння Вольга Грыцук выдала кнігу пра свайго мужа, якога кахала, з якім пражыла ўсё жыццё. І нам застаецца толькі ёй падзякаваць за светлую памяць пра Аляксея Грыцука, які быў родам з Беласточчыны.

Сяргей ЧЫГРЫН

Фота з кніжкі В. Грыцук „Мы стваралі сваю Беларусь"

Заблытаныя межы

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Волька Антанюк выйшла на свой трасцяніцкі дагледжаны падворак, парослы стрыжанай мураўкай, спярэшчанай цвітучым белым арэшнікам. За каванымі весніцамі, аздобленымі зубчатай пілою, за хатай, абшытай белымі дошкамі, шопка запоўненая роўна складзенымі паленамі дроў, альтанка, жаўцеючая новымі дошкамі, дзе столік ды лавы, на якіх могуць пасядаць госці, ды вялікія каменныя гародчыкі, на якіх шчыруе малодшая дачка. Ад сёння Аня ўжо магістр — толькі што абараніла дыпломную працу пра настаўнікаў у час панавання Інтэрнэту на апякунска-выхаваўчай педагогіцы. Аня вучылася завочна, на платным напрамку, дык вельмі цяжка было маці-ўдаве за свае 630 злотых пенсіі справіцца з аплатамі. Бо ж самому пракарміцца трэба, і апрануцца. Добра, што абедзве дачкі такія добрыя, некапрызныя, пільныя да навукі і да працы, памагаюць і нічога не просяць. А абедзве пакончылі штудыі — старэйшая, эканамістка Мажэна працуе ў гатэлі „Галэмбеўскі". Такія добрыя дзяўчаты, не возьмуць у рот ні цыгарэты, ні кілішка. Затое і не бываюць сярод людзей, сярод моладзі, якая гэтага не пазбягае, і дзяўчат-прыгажунь лічаць адлюдкамі і крыху дзівачкамі. А пры іх красе ды такім характары дык кавалераў было б хоць адбаўляй! Так мяркуе маці Вольга, а мы з сябрам і не думаем запярэчыць — не сляпыя ж! І не дзіў, што свежаспечаная магістр крыху сароміцца, сплёўшы залатую касу вакол галавы, бліскае загарэлымі нагамі ў шортах, завіхаецца над сваімі палеткамі, поле, палівае, агортвае. Яшчэ перад ёю канікулы — а тут і працу шукаць трэба будзе. Добра было б, напрыклад, натрапіць на занятак у беларускім садку, бо родную мову Аня Антанюк ведае. Маці ківае галавою: цяжка з працай будзе, калісьці было прасцей. Сама яна працавала м.інш. прадаўшчыцай. Цяпер то без адукацыі, хоць бы і вышэйшай, нават і не збірайся шукаць добрага занятку. Таму ўсе сілы Вольга Антанюк паклала на тое, каб дочкі здабылі адукацыю. А цяжка было, бо муж ад кілішка не адмаўляўся, ад таго і памёр. І тым усім сваім непрабудна-гарэлачным жыццём Вольчын муж нават пасля свайго скону значыць яе жыццё. Выводзіў жонку з нерваў, выбіваў апошнія слёзы. Тое, што ад яго засталося, дагэтуль прыносіць амаль адны турботы. Гэта і радзінны лес у Сацах, які застаўся ў спадчыну Вользе, Мажэне і Ані. А лес сабе расце, густа, падсяваецца сасновы маладняк, таўсцейшыя бярозы, ядловец. Сорак-пяцьдзесят гадоў яму. Ужо і ягады там, і грыбоў часам столькі, хоць кашом насі. Лес прыватны, на вузкіх (30 м) і доўгіх (350 м) палосках. У той бок нячаста ездзіць з Трасцянкі на ровары Вольга.

Пяць гадоў таму пералічвалі тыя сацоўскія метры, геадэзісты паставілі слупкі, паміж палоскамі працялі межы-трыбкі, парабілі зацёсы на дрэўцах. Сусед Васіль З. з Сацоў наняў тады чалавека для рубкі, заплаціў таму, дык Вольга сказала, каб забіраў усю драўніну з тае прасекі; колькі там таго матэрыялу: тоненькія ды крывыя сасонкі, адно на апал у печку. А каб узяць дрэва з уласнага лесу, патрэбен мала што дазвол са староства, але і ляснічага — ён, праўда, адказвае перш за ўсё за дзяржаўныя лясы, але кожнае дрэва, якое нават і калі ты сам яго пасадзіў ды выгадаваў — уласнасць не толькі твая. Асабліва калі расце яно ў месцы, дзе дыхаюць Зялёнымі лёгкімі краіна і ўся Еўропа. А дыхаць усім людзям трэба, як і паліць у печах, пры нашым клімаце.

Ляснічага Вольга паведаміла была, што атрымала дазвол з павета і мае паперу. Ляснічы дзяжурыць тры разы ў тыдзень пры прыватных лясах, адзваніў, што прыйдзе праз дзень-два, аформіць справу, памеціўшы адпаведна драўніну. Сабрала ўдавіца пару асоб, пад'ехала на ровары, паказала свае ўчасткі работнікам. Мелі справіцца да вечара, звёзшы сухастой у Трасцянку на падворак ды парэзаўшы іх на палены. Уласніцы лясных участкаў у суседняй вёсцы н-р 634, 636, 637 і 882 (разам больш за 2,80 гектара) прывезлі на падворак таксама больш за 20 ствалоў сасонак і адну бярозку. Ссечаных памылкова ў канцы ўчастка Васіля З., юрыста, які пражывае пастаянна ў Беластоку. Аб пакражы паведаміў яго сваяк. Паліцыя завітала на падворак удавы Антанючыхі. Спалоханая кабета закліналася, што работнікі не ўбачылі мяжы, ужо зарослай самасеем і падлескам, а і зацёсы на дрэвах загаіліся і сталі невідочнымі. Гатова была аддаць драўніну ды ў прыдатак трыста злотых, каб толькі не цягацца па судах. На жаль, юрыст-пенсіянер, агорнуты справядлівым палам станаўлення справядлівасці адказаў, што грошай яму не трэба, а трэба належным чынам пакараць зладзейку, „каб больш не хадзіла ў шкоду".

Гродскі суд палічыў, што шкода была ўчынена 16 мая 2006 г. на ўчастку Васіля З. выпадкова ды пакараў Вольгу Антанюк штрафам у 300 злотых адно за тое, што не было на дакуменце з паметкамі староства заўваг ляснічага, без прапажы драўніны, да таго кампенсацыяй 30 злотых і аплатай судовых коштаў. Пракуратура ў верасні 2006 г. спыніла справу, не прыкмеціўшы наўмыснасці абвінавачанай у крадзяжы, упэўненай, што бярэ драўніну з уласнага ўчастка, тым больш, што немагчыма было пасля сцвердзіць, з якога ўчастка паходзілі сасонкі. Пакрыўджаны Васіль З. падаў суседку ў вышэйшую інстанцыю, хоць абвінавачаная прасіла і яго, і суд, каб палагодзіць справу і дагаварыцца. Драўніна ляжала далей на падворку Антанючыхі, хоць сакратарыят суда ў Бельску прыслаў паведамленне, што згаданы штабель пянькоў шырынёю 40-50 см у стусе 1,3 м х 0,8 м аддадзены ў распараджэнне II карнага аддзела Раённага суда. А абвінавачаную паслалі на даследаванне ў псіхіятрычную бальніцу, каб праверыць, ці здольная яна кіраваць сваімі паводзінамі і ці не „пагражаюць яны сур'ёзнай небяспекай для юрыдычнага парадку краіны". Адмовілі таксама дармовай дапамогі адваката (быў ужо наначаны ёй абаронца „Нівы" Мацей Грышкевіч), паколькі было сцверджана, што незалежна ад таго, што пенсіі ў абвінавачанай ледзь хапае каб выжыць, ды ў змозе яна ўтрымліваць дачку-студэнтку і плаціць ёй за школу.

— Заўзяліся на цёмную кабету... Я ж не была ніколі ні ў судах, ні на пастарунку! Плакала я і ў бальніцы — то ж страшна мне было. Невядома куды пайсці, да каго звярнуцца. Перада мною стаяў вядомы ў ваяводстве юрыст, які палічыў мяне звычайнай зладзейкай. Благала я яго, каб закончыць справу, — аддам яму ўсе грошы, вярну тыя няшчасныя дровы! А ён з мяне смяяўся! Бо ці ж не абдурыш невучоную бабу? Пачнеш польшчыць у тых судах, то толькі пасміхаюцца, бы ты з таго дрэва толькі што злез.

На справе пакрыўджаны Васіль З. блага ацэньвае падлікі коштаў драўніны, якую зрабілі кансультанты: адно ў 144,96 зл. Сведчыць пра іншыя справы, не звязаныя канкрэтна з выразкай дрэўцаў. Між радкамі можна дадумацца пра нейкія былыя непаладкі з сацоўскай сям'ёй мужа Антанючыхі. Ды героямі з'яўляюцца перш за ўсё дрэўцы — сухастой, ветраломы, крывулі. І адна дужманая сасна, якую звалілі быў вецер упоперак участкаў, верхавінай упаўшая на частку Вольгі Антанюк. Забраў той вяршок тады яе сваяк. Усё можна прачытаць у пратаколах з судовых разбораў. Суд у Бельску падыходзіць да справы вельмі сур'ёзна і скрупулёзна. За ацэнку кошту драўніны, усяго лясочка, пры таксацыі дрэвастою на пні, карты, фатаграфічную дакументацыю заплаціць прыйдзецца таму, хто прайграе. Каб было справядліва і каб ніхто больш не ўздумаў „ісці ў шкоду".

27 красавіка 2007 г. Раённы суд ад імя Польскай Рэчы Паспалітай прыгаварыў Вольгу Антанюк на 3 месяцы зняволення за злачынства з артыкула 278 § 1 п. к., паколькі не даказала ненаўмыснасці свайго дзеяння. Паколькі ніколі раней не мела яна канфлікту з законам і па прычыне ўзросту ды малой вартасці шкоды, суд „рызыкнуў у адосінах да яе пазітыўны крыміналагічны прагноз" і адтэрміноваў выкананне пакарання на 2 гады для спробы. Мае яна заплаціць пакрыўджанаму Васілю З. 293,30 зл. і капменсацыю ўсіх аплат, панесеных судом. Драўніну вяртаць не мусіць.

— Ну, ад турмы і ад торбы на старасць не заракайся! — уздыхае Вольга Антанюк. — Адно часу шкада. Год праляцеў... А я як учарнелая хаджу...

Міра ЛУКША

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2007 r. upływa 5 września 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połudn. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 500 egz.

Суседскія былі

БАЦЬКАВА НАВУКА

— О божачка ж ты мой, ой людцы вы мае! Вочкі б мае таго не бачылі, вушы б не чулі! А за што ж мне такая доля, за што такая кара, — загаласіла Слаўкава жонка як толькі муж расчыніў дзверы сваёй хаты. — Во дзе кроў якая, паганая! Усё адно сваё возьме. Хоць ты маліся, хоць прасіся, толку ніякага. Казала ж мне мама некалі, што жыцця з Супрунамі не будзе. Увесь род алкаголікі. Уся радня да аднаго. Ад малога да вялікага — усе абы толькі рыла заліць. А я ж дурная была, маладая. Не паслухала маму. Так усё жыццё і змарнавалася!

— Што праўда, то праўда, — не разабраўшыся ў чым справа ўклініўся ў спрэчку галава сям'і. — Маладая была дурная і зараз не паразумнела. Яшчэ больш мазгі высахлі. Уся стала як твая тупая мама. З той уся вёска смялася, а з цябе цэлы горад.

— Злыдзень ты, — яшчэ больш загаласіла жанчына. — Як у цябе язык паварочваецца так гаварыць. Усё жыццё рабыняй у цябе была. Толькі і знала, што дагаджаць і табе, і радні тваёй спітай, і сябрам тваім, такім як ты п'яніцам. А падзякі ні якой. А за што ж мне такія пакуты! О божачка ж ты мой, божачка! Ой людцы вы мае!

— Добра-добра, не лямантуй, — стаў супакойваць жонку Слаўка. — Чаго разышлася як свіння на дождж? Я ж сёння цвярозы як шкло ў акулярах тваёй мамы. Што зноў здарылася?

— Ты то можа адзін дзень і не налізаўся, — уткнулася носам у ручнік тая. — А вось сынок твой увесь у цябе пайшоў. Не паспеў школу закончыць, яшчэ ў войску не быў, жыцця не бачыў, а ўжо прыйшоў дахаты ніякі. Чорны як зямелька. Набраўся гарэлкі недзе, паскуда, што нават лыка не вяжа. Ажно мову адняло. Праўду людзі кажуць — яблык ад яблыні далёка не адкоціцца. Увесь у тату.

Супрун скасіў вочы на канапу і ўбачыў непрытомнага сына. Той быў так напіты, што нават лямант матулі, ад якога ўсе суседзі сабраліся пад хатай даведацца з чаго такая паніка, не даходзіў да вушэй маладога Супруна. Ён ляжаў тварам уніз і ціхенька соп сабе ў дзве дзіркі. Салодка так спаў, як пшаніцу прадаўшы.

— А каб табе было добра! — плюнуў бацька на падлогу. — Ну нічога, няма тут чаго енчыць. Хлопец малады, не спрактыкаваны яшчэ. Нюхнуў і паваліўся як падла. Нічога страшнага, не канец свету. Проста не ўмее адпачываць. Не навучаны. Бо не было патрэбы вучыць. Заўтра я гэтым займуся. Трэба дзіцяняці растлумачыць колькі можна выпіць і чаго. Ён жа ўжо мужчына. А ў кампаніі, дзе людзі культурна адпачываюць, не будзеш жа сядзець і жаваць смаркачы. А ён, не ўмеючы, глынуў лішняга, вось і зарыгаўся. Я заўтра яму ўсё растлумачу — і з кім трэба піць, і колькі, і як пры гэтай справе застацца чалавекам. З раніцы яму будзе галава балець, па сабе ведаю. Вось і сходзім на піва. Там усё і давяду хлопцу. Ці лепш віна вазьму, каб паказаць, што з кілішкам добрага віна можна правесці час як чалавек. І не трэба пры гэтым напівацца. А гарэлку есці яму яшчэ рана.

Супрун быў чалавек слова. Калі пабяцае што, то разаб'ецца ў дошку, а зробіць. Такі быў яго мужчынскі гонар. Нават чужому слова датрымае. А тут родныя. І як толькі сын на раніцы абудзіўся, бацька ўжо быў на нагах як штык на аўстрыйскай стрэльбе.

— Ну што, апівош, — ласкава сказаў ён, — галава баліць?

— Крыху, — глянуў на бацьку мутнымі як багна вачамі малодшы Супрун.

— Ну нічога, — усміхнуўся Супрун старэйшы. — Хадзем на піва. Дам табе навуку як з алкаголем сябе паводзіць. Гэта ж табе не жарты. Так і дакаціцца можна да самога дна гэтак хлябаючы як ты ўчора. Гарэлка — ядзерная бомба. Тут асцярожна трэба захоўвацца, як на разведцы.

У бары бацька з разумным, і разам з тым з заклапочаным паводзінамі сына тварам заказаў два бакалы віна. Супруны селі за столік.

— Ты не глядзі на розных там, лабідудаў. З бакалам віна можна разумна прасядзець цэлы вечар і радавацца сяброўскай размове ў кампаніі ды іншымі добрымі рэчамі цешыцца. А што толку з тае гарэлкі. Вось хораша як набярэшся той гадасці як свінюка гразі і людзі з цябе смяюцца як з блазна, — пачаў навуку бацька, але нечакана і для сына, і для самога сябе па прывычцы асушыў бакал нагбом.

— Ты на мяне не глядзі, — схамянуўшыся, працягваў ён. — Я ўжо стары. А табе трэба яшчэ жыць. А жыццё, я табе скажу, вялікая навука. Жыві не так, як я жыву, а так, як я вучу. Пайду, вазьму сабе піва.

Праз нейкі час і бацька, і сын ужо сядзелі з некалькімі пустымі бакаламі ад піва, а навучанне працягвалася.

— Я ў твае гады, — падняў Слаўка палец угору, — ужо працаваў як вол на млыне. І ведаў колькі трэба піць, каб чалавекам застацца. Гэта зараз вы, маладыя, поўзаеце ўсюды як прыблуды і нідзе прыбіцца не ў змозе. Так нельга. Трэба працаваць і слухаць бацьку як поп матушку. І не злоўжываць гарэлкай. Дарэчы, па сто пяцьдзесят гарэлкі не пашкодзіць. Півам душу не падманеш. Але гэта мне сто пяцьдзесят. Табе хопіць і сто трыццаць пяць. Глядзі ў мяне, паскуднік ты такі.

І бацька памахаў кулаком перад тварам сына. Пасля яшчэ раз узялі па сто пяцьдзесят і сто трыццаць пяць. Пасля яшчэ нешта бралі.

— Ай, трэба яшчэ піва, — ужо недзе за поўдзень, чапляючыся языком за зубы, прамямліў настаўнік. — Гарэлка без піва — грошы на вецер. Толькі ты ў мяне ўзірайся! Табе малы кубак. І ні-ні. Каб нават і не думаў больш выпіць.

А жонка Славіка ўжо ўсе вочы праглядзела, дзе гэта дзеліся мужчыны. Цэлы дзень прайшоў, а яны зніклі як сасіскі з шыі ў сабакі. Ужо і вячэра на стале астыла, а іх няма і няма. Прапалі як ранішні туман. Дакладней, разам з ранішнім туманам. Ды нарэшце ля дзвярэй пачуліся няўпэўненыя крокі.

— Эй, жанчына, — пачула яна голас мужа, — біць цябе няма каму і мне няма калі. Адчыняй хутчэй дзверы, пакуль мы іх нагамі не вынеслі.

Перапужаная кабета хутчэй паспяшалася да дзвярэй. Куляй падскочыла і гэтак жа імгненна адчыніла. У хату, абняўшыся і падтрымліваючы адзін другога, уваліліся бацька з сынам. Не разуваючыся і не распранаючыся, і не гаворачы больш ні слова, з каменнымі як у статуй тварамі і расхрыстанымі да пупоў кашулямі яны накіраваліся да канапы ледзьве перасоўваючы забруджаныя балотам ногі. Пасля, гэтак жа абняўшыся, паваліліся ўпоперак канапы тварам уніз і захраплі ў чатыры дзіркі. Салодка так заснулі, як пшаніцу прадаўшы.

Віктар САЗОНАЎ

22.07 – 28.07

Баран (22.03. — 20.04.) Не праводзіш часу бестурботна, усё думаеш пра камфорт сям'і. Грошы заробіш маланкава, ды нічога не адкладзеш. Больш канцэнтрацыі на фірме. Пераканаешся, што не ўсе дзейнічаюць „фэр" (лепш мець сумленных ворагаў, чым няшчырых сяброў).

Бык (21.04. — 21.05.) Калі завельмі сканцэнтруешся на здабыванні грошай, можаш страціць важнейшае. Каханне стукае ў дзверы разпораз. Час на сур'ёзныя размовы, аналізы і паправу адносін у пары. Можаш зарабіць грошы, аб якіх і не марыў (іграй!).

Блізняты (22.05. — 22.06.) Можаш спадзявацца павышэння. Будуць належна ацэнены твой спрыт, інтэлігентнасць, адвага. Нагоды зарабіць дадатковыя грошы. Ды асцерагайся, каб не страціць таго, што зарабіў (не іграй!).

Рак (23.06. — 23.07.) Можаш разлічваць на апеку і падтрымку сяброў. Затое з адным сябрам будуць турботы. Адмовішся ад праектаў, якія ты лічыў раней важнымі. Не схочаш працаваць з кімсьці, да каго ты страціў давер.

Леў (24.07. — 23.08.) Ты здольны да таго, каб перамагчы любыя перашкоды. Засяродзься аднак найбольш на сабе і сваім партнёры. Тым больш, што чакаюць цябе незямныя жарсці! Хоць непаразуменні і інтрыгі ў сям'і могуць давесці да сур'ёзнага канфлікту.

Дзева (24.08. — 23.09.) Магчымыя сваркі на працы, асабліва з Ільвамі. Ды раздражненасць пойдзе на спад. З 27.07. твае геніяльныя ідэі захопяць усіх, а найбольш твайго партнёра.

Шалі (24.09. — 23.10.) Не намагайся на нейкія амбітныя мерапрыемствы, лепш адпачывай. Вольныя Шалі могуць пераканацца, што ідэалаў мала ходзіць па свеце, а ўява прыгажэйшая ад рэальнасці. Не выдавай, пакуль не заробіш!

Скарпіён (24.10. — 22.11.) У тваім знаку паявіўся Чорны Месяц Ліліт і будзе турбаваць цябе пару месяцаў! Сілаў, праўда, табе хопіць, ды сустракаць цябе будуць немалыя цяжкасці. Моцна ўключышся ў важныя мерапрыемствы. Будзеш бунтавацца супраць усіх абмежаванняў. Калі ў тваёй пары блага, можаш застацца адзін. Калі агортвае цябе шал, ідзі патрэніруйся. Зважай на праблемы з нутром.

Стралец (23.11. — 22.12.) У пачуццях патрабуеш доказаў! Маеш шанцы на павышэнне. Выразны прыліў сілаў. Адкрываюцца рэдкія шанцы. Ды дай сабе шанц крыху паленавацца і ўрэшце адпачыць!

Казярог (23.12. — 20.01.) Адвага, прадпрымальнасць. Да 25.07. пазбягай падарожжаў і кантактаў з чужаземцамі. Дбай пра добрую атмасферу ў сям'і.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Да 25.07. магчымыя немалыя фінансавыя завіраванні. На шчасце знойдзеш развязку і ўсё вернецца да нормы. Шмат спраў убачыш у іншым святле.

Рыбы (20.02. — 21.03.) З-за сваіх неразважлівых дзеянняў можаш мець вялікія страты. Няладна і ў кампаніі, і ў інтарэсах. Не праводзь важных размоў. Не згаджайся на тое, што табе не пасуе; ідучы на кампраміс, можаш вельмі многа страціць. Будзь спакойны і абачлівы!

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

1. руку мые, 2. пахучае арганічнае рэчыва са стручкоў ванілі, 3. французскі горад між Лілем і Бруселем, 4. сталіца Эквадора, 5. горад у цэнтры расійскай аўтаномнай рэспублікі Комі і... ў слове бухта, 6. адна вясны не робіць, 7. Альфрэд, амерыканскі кінарэжысёр, майстар трылераў (1899-1980), 8. левы прыток Дняпра з крыніцамі пад Смаленскам, 9. здаровы ў здаровым целе, 10. кухонная печ з канфоркамі, 11. чалавек заклапочаны толькі такімі справамі, якія прыносяць найбліжэйшую асабістую выгаду, 12. буйная драпежная марская рыба.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — пагаворка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

1				2					
3									
			4			5		6	
		7				8		9	10
	11								
							12		

Адказ на адгаданку з 24 нумара

Агонь, быль, Ван, душа, жаба, міна, моц, німб, павець, рыжык, уюк, цаца, чыж, чын, юань, ям.

Рашэнне: **Кожны мужчына марыць аб жанчыне, якую мог бы любіць, шанаваць і падманваць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем для **Тамары Дземянчук** з Гданска і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
НА БАСОВІШЧА

basowiszcza

ARHANIZATAR: BIAŁORUSKIE STOWARZYSZENIE STUDENTÓW

19-21.07.2007

[ČAĆVIER, PIATNICA, SUBOTA]

FARBEN LEHRE
N.R.M.
NEURO DUBEL
PAŁAC
RASTA
B:N
ŚCIANA
KRAMBAMBULA
TAV. MAUZER
RIMA
ČPB
KRAMA
IQ48
ŽNIČ

PROGRAM

Czwartek 19.07.2007
19.00 Otwarcie festiwalu
19.15 Błękitny Nosorożec PL
19.50 Ludzi światła BY
20.30 S.D.M. BY
21.10 Rima PL
22.00 Pałac BY
23.00 B:N BY
23.50 Ściana BY
00.50 Tav. Mauzer BY
02.00 Zakończnie

Piątek 20.07.2007
15.00 Część konkursowa
18.30 Parason BY
19.10 Nevma BY
19.50 Žnič BY
20.40 Ogłoszenie wyników
20.55 5set5 PL
21.45 Krambambula BY
22.45 Krama BY
23.45 Farben Lehre PL
01.00 Neuro Dubel BY
02.15 Zakończenie

Sobota 21.07.2007
15.00 Wolna scena
18.00 Mountainside LT
18.40 Tarpach BY
19.30 Laureat 3
20.00 Laureat 2
20.30 Laureat 1
21.10 Tiń soncia UA
22.00 N.R.M. BY
23.15 ČPB BY
00.15 IQ 48 BY
01.15 Rasta BY
02.15 Zakończenie

Zrealizowano przy wsparciu finansowym Urzędu Marszałkowskiego Województwa Podlaskiego w Białymstoku

ZWIĄZEK BIAŁORUSKI w RP





www.basowiszcza.org

Хто зачаруе журы сёлетняга „Басовішча”?

РоСтра

Гісторыя „РоСтры” пачынаецца з лета 2003 года. Спачатку ўсё ўспрымалася несур’ёзна. Не было файнай апаратуры ды інструментаў. Першы выступ „РоСтры” на шырокую публіку адбыўся ў вечар памяці А. Башлачова 28 мая 2005 года ў клубе „Акварыум”. Менавіта ад гэтага канцэрта лепш адлічваць гісторыю гурту. Далей было шмат выступаў, электрычных і акустычных. Першая беларускамоўная праграма „РоСтры” бярэ свой пачатак з выступу ў час фэсту „Крэўскія камяні” ў 2005 годзе. У 2006 годзе гурт падаваў заяўку на ўдзел у „Басовішчы”, як вынік працы і ўсіх перажыванняў: паездка на „Басовішча” і прыз глядацкіх сімпатый на „Адборышчы”, але вопыт „Басовішча” абазначаў для гурту новыя мэты і задачы. Пасля канцэрта „Vox Femina: Tribute to Flëur” на „ХАТА studio” распачаўся запіс дэбютнага альбома „РоСтры”, рэліз якога запланаваны на верасень 2007 года. Песні „РоСтры” трапілі ў ратацыю некалькіх беларускіх радыёстанцый.

Сайт гурту: www.rostra.info

Склад гурту:

Карпоўская Анастасія — вакал, флейты
Казлоў Эдуард — гітара
Касянкоў Павал — гітара
Леўкавец Яўген — бас
Колтун Аляксандр — бубны
Папрацінская Вольга — менеджэр

Фляўс і Кляйн

Гурт бярэ пачатак у 2003 годзе. У 2003 і 2004 гадах каманда перамагла на фестывалі „Рок-Кола”. Пастаянна выступае з канцэртамі ў клубах Беларусі, а таксама як удзельнікі і госці на шматлікіх фестывалях („АЯ-camp” 2003-2005, „Наша Музыка”, „Нова Рок”, „Двина-Дзвіна-Даугава”, „Продвижение” і г.д.). У 2005 годзе на „Рок-Коле” ў намінацыі „Рок-рысталішча” гурт узяў прыз глядацкіх сімпатый, а на фестывалі „Ты признан быть первым 3” (Масква) — Гран-пры фестывалю. 2007 год прынёс у праграму „Фляўс і Кляйн” беларускамоўнае выкананне песень. У цікавы спосаб, сінкрэтычна, падыходзяць да музыкі, а і сцэнічнай прэзентацыяй пагражаюць канкурэнтам.

Indra

Рок-гурт „Indra” ўтварыўся ў 2003 годзе. Ідэя арганізацыі гурту (тады яшчэ без назвы з індыйскай міфалогіі) належала Марыне Шэф. Узнікла яна ў яе ў 2001 годзе, калі Марына яшчэ вучылася ў Полацкай нацыянальнай гімназіі. „Індрай” гурт вырашыў абазвацца перад выступам на канцэрце „Антыснід” у 2003 годзе. Выбар гучнага імені сярод магчымых ажыццявіўся геніяльна проста: адна з сяброўак тады яшчэ безназоўнага гурту выцягнула з капелюша лёсаносную паперку (па сакрэту, словы, напісаныя на гэтай і астатніх паперках, былі знойдзены ў жыццядайнай кніжцы „Бэн Гур”). З гэтага здарэння і па цяперашні час асноўны склад гурту застаецца нязменным, мяняюцца толькі басісты. „Indra” выступала на рок-фэстах у Полацку, у Езярышчы, разам з іншымі гуртамі ў клубах (P&R, Night City), удзельнічалі ў правядзенні гарадскіх святаў. Гурт быў адзначаны за лепшы вакал на „Рок-Коле 2004”, трапіў у лік лаўрэатаў „Рок-Кола 2005”. Гурт мае дзве іпастасі: рускамоўную і беларускамоўную. Першы альбом пад назвай „Ёсьць кантакт!” быў запісаны ў Полацку, другі альбом „Сонцавакол” стаў вынікам перамогі гурту на інтэрнэт-конкурсе „Зваротны адлік-2006”, арганізаваным „Еўрапейскім радыё для Беларусі”, запісваўся ён у Беластоку на студыі „Рэмбрандт”. У якасці прэзентацыйнага канцэрта новага альбома „Індра” арганізавала ў Полацку на пачатку сакавіка 2007 года імпрэзу „Ноч Ваўкалака”, для ўдзелу ў якой былі запрошаны мінскія „Уліс” і „Рэха”. Ёсць спадзяванка, што „Ноч Ваўкалака” стане штогадовым фэстам і будзе дапамагаць маладым беларускамоўным гуртам выйсці да слухача.

Склад:

Вольга Андрэева — вакал, гітара
Андрэй Галынскі — бас-гітара
Галя Сандова — віяланчэль
Павал Кухто — бубны
Марына Шэф — гітара

Lilith

Гісторыя гурту „Lilith” пачалася ў 2003 годзе. Паводле планаў дзявочая каманда мела быць найпрыгажэйшай, самой паслухмянай, але не так усё было проста. На працягу чатырох гадоў шмат чаго паспела змяніцца да непазнавальнасці. Мяняліся цацкі, сябры, але і месцы: „Добрыя мысьлі”, „Графіці”, „Рэактар”, „Арэна”, „Катакомбы”. У Мінску месца не хапала, таму ў мінулым годзе паспелі злётаць у Бярозу на прэзентацыю дыска „:B:N:” і ў Полацк на „Рок-Кола”. Спрабаваўшы ў мінулым годзе трапіць на „Басовішча”, сёлета, пасталеўшыя, вяртаюцца зноў з песняй „Не ўзгадаеш”. Варта дадаць, што гурт патрапіў у сёлетні конкурс, дзякуючы перамозе ў інтэрнэт-галасаванні.

Склад:

Дарка — вакал
Тацяна — гітара
Іра — клавішныя
Тацяна — бас-гітара
Павал — бубны

SKA!RB

Гурт стварыўся летам 2004 года.

Вынікам першых рэпетыцый былі песні „Лета”, „DIY pornozine”. Баявое хрышчэнне першым канцэртам каманда прайшла 24 снежня 2004 года ў культавым мінскім клубе „28” (rip) на разагрэве піцерцаў „Морэ&Рэльсы”. Пасля ў гурту пачаліся частыя канцэрты. Галоўнай падзеяй у жыцці „SKA!RB” на той час стала вандроўка ў Польшчу — гурт даў пару выступаў у Варшаве і Познані ў межах праекта „Партызанская школа”. „Пацвярджэннем паступовага набліжэння да стану музычна-полавай спеласці” гурт лічыць з’яўленне ў камандзе бубнача ў кастрычніку 2005 года. За час існавання паўдзельнічаў ужо ў болей трох дзесяткаў канцэртах і зараз піша нармалёвае студыйнае дэма.

Сайт гурту: www.ska-rb.com

Склад:

Дзюша С. — вакал/гітара
Батон — вакал, дзікія крыкі
Санёк — гітары
Рома Мульт — бас-гітара
Кнопік — саксафон
Коля — труба
Гарык — трамбон
Лёха — бубны

Sok

Гурт стварыўся ў 1999 годзе ў складзе чатырох чалавек: Jonny, Gorik, Jim, Volas. Два гады яны ўзмоцнена рэпетавалі і нікому сябе не паказвалі. Пасля доўгай працы 7 трэкаў запісаныя „Skat records”. Але шырокага розгаласу яны не атрымалі — дэма разышлося па блізкіх людзях і „памерла”. Новы трэк „Вораг” адразу ж патрапіў на зборнік альтэрнатыўнай музыкі „Hardcore respublika”. Гурт вырашыў паэксперыментаваць з відэа і зняў кліп у „падвальных” умовах. Відэа распаўсюджвалася ў гарадскіх камп’ютэрных сетках і перадавалася з рук у рукі. Як самі кажуць: „Музыка — не гульня, а ўсё астатняе не мае значэння”.

Склад:

Jonny — бубны
Gorik — бас-гітара
Leha — гітара
JiM — гітара
Bond — ударныя
Volas — вакал

Termin X

Гурт утварыўся ў Мінску ў 2006 годзе. Ужо ў мінулым годзе паспяхова выступілі на „Адборышчы-2006” і ўдзельнічалі ў конкурснай частцы „Басовішча-2006”. Да сакавіка 2007 года, у сувязі з ад’ездам бубнача і басіста, рэпетыцыі часова спыніліся. Зараз да гурту далучылі маладыя, але вельмі моцныя музыкі і гурт распачаў працу над новым матэрыялам, частку якога „Termin X” напэўна запрэзентуе ў час фестывалю. А што думаюць наконт самога фэсту: „Вельмі важна, што гэты конкурс („Басовішча”) штогод дапамагае маладым гуртам адкрыць сябе”.

Склад:

Кірыл Домніч — вакал
Копаць Зьміцер — гітара
Павел Палонскі — бас
Павел Мамонаў — бубны

Unia

Гурт „Unia” заснаваны ў 2006 годзе. Музыка спалучае цяжкую рок-музыку з гучаннем дуды, флейты і іншых фольклавых інструментаў, а спяваюць на тры вакалы. За невялікі час існавання гурт граў некалькі дробных канцэртаў у невялікіх мінскіх клубах, аднак паспеў пагграць на адной сцэне з расійскімі фольк-камандамі „Tintal”, „Тролль гнет ель” і з беларускай „Осімірай”. Нядаўна гурт выступаў у конкурсе ў першым туры „The global battle of the bands”.

Weeping Twilight

Гісторыя гурту пачынаецца яшчэ ў 1997 годзе, калі двух падлеткаў апанавала адна ідэя — стварыць метал-гурт. Першай сур’ёзнай справай была спроба агучыць паэму Янкі Купалы „Курган”. 17 сакавіка 2001 года адбыўся першы канцэрт гурту „Twilight” у „А-клубе”.

Пасля зноўку ў гісторыі гурту

„Басовішча” вокам журы

На пытанні адказваюць:

Марцін „Orion” Полэць — музычны журналіст, які штодзень складае інтэрнэт-часопіс „Pro-rock”, чарговы раз будзе ўдзельнічаць у працах журы ФММБ „Басовішча”, вялікі сябра фестывалю.

Лукаш „Стэп” Сцепанюк — музычны журналіст, заснавальнік і музыка беларускіх гуртоў „Вядро” ды „Праект 2001”. Працуе на радыё, стварае электронную музыку і распаўсюджвае цікавінкі з жыцця беларускіх музыкаў.

1. Чаго спадзяешся па сёлетнім фестывалі „Басовішча”?

Марцін: — Спадзяюся цяжкай канфрантацыі ў час працы журы, пару прыкрых (кепскіх) канцэртаў, пару арганізацыйных недахопаў, адным словам — як заўсёды самай лепшай гульні ў годзе, гэтым разам на адзін дзень даўжэйшай.

Лукаш: — Спадзяюся, што ў канцы маладыя гурты зломяць усебаковыя адчуванні зорнасці гурту „Н.Р.М.”. Чакаю вялікага шоу з боку „Таварыша Маўзэра” і „ЧпБ”.

2. Што Табе наймацней запомнілася за мінулыя фестывальныя гады?

Марцін: — Выдатныя канцэрты: „Тарпач” (2005 г.) ды „ЧпБ” (2006 г.), але таксама добрыя выступленні „Сцяны”, „Siddharthy” і „B:N” (2005 г.), „Тройцы” з мінулага года, „Zero-85” (2004 г.). Таксама тэхнічныя праблемы гурту „Аніма” ў час конкурсу ў 2004 г., калі з-за праблемы з гітарай не прайгралі ні адной цэлай песні. Аднак, дзякуючы непакорнасці ды харызме вакалісткі і цікавай музычнай прапанове ды насуперак усім складанасцям, гурту ўдалося не толькі здабыць спачуванне ў публікі, але ў галоўным вялікую сімпатыю.

Лукаш: — З мінулых фестываляў напэўна не забуду канцэрта „IQ48” з 2005 г. Паводле мяне гэта быў найбольш энергетычны ды сапраўдны канцэрт. Гэтыя маладыя людзі проста жывуць сваёй творчасцю і гэтае відаць. Напэўна таксама не забуду культавых ужо канцэртаў падляшскіх гуртоў „R. F. Braha” і „Кардон”.

3. Які будзе вырашальны фактар пры ацэнцы конкурсных гуртоў і чаго ад іх чакаеце?

Марцін: — Перад усім чакаем арыгінальнасці, свежасці, новых музычных думак. У час апошняга адборачнага туру журы адкінула 80% гуртоў, якія прэзентавалі такі падыход, а якіх я ахвотна бачыў бы ў ролі лаўрэатаў. Усе неяк прывыклі, што „Басовішча” — гэта рок-фестываль, нават з ухілам у бок металёвай музыкі. Таму пэўна лёгкай рукой выканаўцаў фольк, інды, пост-рока прынцыпова выключылі б з конкурсу, зачынілі б іх у запаведніках, бо як можна ў адным конкурсе іграць так розную музыку? А добрая музыка не ведае межаў, палічак, не паддаецца спробам катэгарызацыі — гэта проста музыка. Шчасліва, як паказвае прыклад нядзейсненага канкурсанта двухгадовай даўнасці „ЧпБ”, і без перамогі ў конкурсе можна на працягу года здабыць вялікую папулярнасць.

Лукаш: — Ад канкурсантаў заўсёды чакаецца чагосьці новага. Пэўна цяжка будзе знайсці новыя якасці, але ўзровень не будзе нізкі. На жаль, тэхнічныя ўмеласці не заўсёды цікавыя гледачам.

4. У чым адметнасць гэтага фестывалю? Вядома, калі яна ёсць.

Марцін: — Прыгожая мова, цудоўная славянская культура і цёплыя, сардэчныя, сапраўдныя людзі. Людзі з высакароднымі сэрцамі, якіх штодзень немагчыма сустрэць у Польшчы, а тым болей на Захадзе.

Лукаш: — Адметнасць фестывалю ў тым, што ён — шматбаковы сімвал свабоды. Па-першае, адбываецца ў лесе, дык рабі што хочаш! Па-другое, ніхто нічога не забараняе выступаючым. Па-трэцяе, гэта адзіны ў свеце фестываль, на якім асноўнай справай з'яўляецца мова!

Вольная сцэна

Польшча:
„Blackest”
„Cunning Plan”
„Kaganiec”
„Wildhawk”
„Plateau”
„Schody”
„Bad Falcon”

Беларусь:
„Заточка”

НІВА & БАС аб'яўляюць КОНКУРС/KONKURS

На самы лепшы канцэрт фестывалю

Wybierz najlepszy koncert festiwalu!

Узнагароды!!! Nagrody!!!

Конкурсны купон укіньце ў адмысловую скрынку з надпісам Конкурс „Ніва & БАС”

Прызы:

Белсат — статуэтка і грашовая ўзнагарода 5000 зл., прадукцыя кліпаў тром лепшым гуртам фестывалю
Радыё Беласток — 20 гадзін запісу на студыё „Рэмбрандт” з гукарэжысёрам або 40 гадзін без гукарэжысёра
Apollo Records — 40 гадзін запісу без гукарэжысёра
Войт Гарадоцкай гміны — грашовая ўзнагарода 1000 зл.
Тыднёвік „Ніва” — грашовая ўзнагарода 1200 зл.
Радыё „Рацыя” — грашовая ўзнагарода 1100 зл., прамоцыя альбома ў эфіры і на сайце, а таксама гадавая гарачая ратацыя ў эфіры (песні гурту тры разы ўдзень)
Беларускае аб'яднанне студэнтаў — грашовая ўзнагарода 1800 зл.
Польскае Радыё для замежжа — грашовая ўзнагарода 1360 зл.

Журы:

RWD — сайт „Тузін гітоў”
Таццяна Заміроўская — „БелГазета”
Ганна Вольская — прадзюсар
Віталь Супрановіч — БМА group
Воля Кузьміч — generation.by
Міхал Анемпадыстаў — мастак, паэт
Ілона Карпюк — музыка, БАС
Лукаш Сцепанюк — Радыё „Рацыя”
Багуслаў Каспэрук — музыка
Марцін Полэць — музычны журналіст
Лёнік Тарасэвіч — мастак
Агнешка Рамашэўска — БелСат
Славамір Сакалоўскі — музычны журналіст

змены, але з'явіўся дэма-запіс з назовам „Twilight”. У лютым 2002 года гурт паказвае сябе на канцэрце з нагоды дня нараджэння Ліцэя БДУ. А вясной і новы назоў — „Weeping Twilight”. У жніўні ўдзельнічалі ў кіна-рок-фестывалі ў Барысаве. А 13 верасня 2002 года выйшаў міні-альбом „Weeping Twilight” — „Воддаль ад твару багоў”. У кастрычніку 2002 года гурт, прайшоўшы слухацкі адбор, удзельнічае ў „MassaBruttoFest” разам з „Asguard”, „Evthanazia”, „Rossomahaar”. 3 снежня 2002 года „Weeping Twilight” гасцюе ў праграме „Затерянный мир”. У розны час „Weeping Twilight” удзельнічаў у фестывалях „Shiseido Fest”, „No Presents for Christmas”, „Massa Brutto”, „Old Land” ды іншых. Зараз музыкі працуюць над запісам поўнафарматнага альбома „Парасткі памяці на руінах былога”.

Сайт гурту: www.weepingtwilight.com

Склад:
Аляксандар Глякаў — бас-гітара, вакал
Міхал Васількоў — бубны
Віталь Абрамовіч — гітара
Алег Грынько — гітара, дуда

ZIGZAG

Праект „ZIGZAG” быў заснаваны Ігарам Загумёнавым (вакал, гітара, аўтар песень) у канцы лета 2003 года. „ZIGZAG” дэбютаваў з кліпам на песню „Кастрычнік”. Кліп заняў першае месца ў праграме „Кліп-абойма” на тэлеканале БТ і пасля патрапіў у ратацыю 1-га музычнага канала і СТВ. У гэты ж час, у праграме Аляксандра Ціхановіча „Гіт-момант”, была прадстаўлена песня „Зігзаг”. Затым гурт прыняў удзел у праграме „Наша музыка” на Альфа-радыё, дзе песня „Палымянае неба” заняла першае месца. Вясной 2003 года з'явіўся новы кліп „Пабудзі мяне” — першы беларускі кліп, створаны выключна пры дапамозе 3-D анімацыі мастаком Аляксеем Несцеравым. Гэты кліп заняў другое месца ў праграме „Кліп-абойма” і стала з'яўляўся на Першым музычным канале. Гурт час ад часу выступаў на „альтэрнатыўных тусоўках” у мінскіх клубах, неаднаразова прымаў удзел у розных тэлепраграмах: музычны рынг „Кропка”, „5/5”, „Усё нармалёва, маці”, „Кліп-абойма”, „Добрай раніцы, Беларусь” ды інш. Песні гурту „ZIGZAG” сталі з'яўляцца ў ратацыі некаторых радыёстанцый. За песню „Малітва” Ігар Загумёнаў быў абраны адным з трох прэтэндэнтаў у намінацыю „Лепшы кампазітар года” тэлефестывалю „На скрыжаваннях Еўропы”. Прэм'ера англамоўнай песні „Mine-Free World” адбылася на гала-канцэрце „Свет без мінаў” у Найробі (Кенія) у лістападзе 2004 года, у выніку чаго „ZIGZAG” атрымаў прапанову аб удзеле ў міратворчым гастрольным туры па Афрыцы. У снежні на беларускіх тэлеканалах адбылася прэзентацыя кліпа „Гара”, знятага ў гарах Босніі. У сакавіку ж пачаўся продаж дэбютнага альбома гурту пад назовам „Bionic@”, запісанага ў студыі „X-noise Factory”. Далей „ZIGZAG” выступае на гала-канцэрце супраць расізму ў сталіцы грэчаскага Кіпра (Нікасія) з песняй „Song of the Wave”. На фэсце была выкананая яе беларускамоўная версія — „Песня Хвалі” з альбома „Bionic@”. На Кіпры (курорт Ларнака) адбыўся таксама і клубны выступ перад удзельнікамі міжнароднай канферэнцыі „Bridging Cultures and Identities”. Была выканана м.інш. беларуская народная песня „Купалінка”. Неўзабаве „ZIGZAG” запісаў новую версію песні „Кастрычнік”, якая ўвайшла ў зборнік песень на вершы Ларысы Геніюш („Жыць для Беларусі”, БМАgroup). Улетку 2006 года на песню „Song of the Wave” выходзіць кліп (MTV, Першы музычны канал, ОНТ, БТ, СТВ), а песня „Кастрычнік II... Нейк сумна” па выніках года ўвайшла ў топ 12 хіт-парада „Тузін Гітоў” і была выдадзена на складанцы „Прэм'ер Тузін 2006”. У сакавіку 2007 года „ZIGZAG” ладзіць музычную правакацыю, прэзентуючы ў Інтэрнэце нефарматны кліп на песню „Тры расейскія літары!!!”, прысвечаны антыглабалізму, барацьбе з мацюкамі, блатной культурай і „адвёрткай”...

Склад:
Ігар Загумёнаў — вакал
Іван Селішчаў — гітара
Сяргей Воўк — клавішныя
Уладзімір Скарапупаў — бас
Аляксей Яфрэменка — бубны

Галасую за / Głosuję na

.....

Імя і Прозвішча / Imię i Nazwisko

.....

тэлефон.....

e-mail.....

Падляшская доля...

Што будзе з беларускай музыкай на Падляшшы? Гэтага ніхто пэўна не ў змозе прадбачыць. Пакуль існуе „Басовішча", напэўна раз у год будзем слухаць беларускія тэксты. Але што на працягу ўсяго года? Надзея ў двух апошніх, пакуль што, гуртах, якія актыўна працуюць. На думцы маюцца гарадоцкія **„Rima"** і **„5set5"** (бо неяк апошнім часам не чуваць нічога пра **„Zero-85"**). Некаторых можа і здзіўляць, што гэтым гуртам хапае дэтэрмінацыі ў такой нішы, але ніхто не ведае на як доўга. Не цешыць напэўна таксама факт, што ў конкурсе не пачуем ніводнага гурту з Падляшша, а важныя для маладых гуртоў узнагароды ў якасці запісаў музыкі ці відэа будуць размяркоўвацца між гурты выключна з Беларусі. У такой сітуацыі напэўна варта падтрымаць гарадоцкія гурты ў час іх канцэртаў, бо што б не казаць, а ў пэўным сэнсе яны найбліжэй першапачатковай ідэі „Басовішча" — фестывалю патрэбнага беларусам Падляшша!

Упершыню на „Басовішчы"

„Тінь Сонця" — гурт нарадзіўся ў 1999 г. у Кіеве. Першы канцэрт адбыўся ў Жытоміры ў 2001 г. у час фестывалю „Новий Зоряний Дощ", а тры гады існавання завяршылі альбомам „Святість Віри", тады яшчэ ў жанры альтэрнатыўнага рока. Сучасны характар гурту акрэсліваць найлепш як фольк-метал, а гэты напрамак музыкі абралі напрыканцы 2002 г. Музыкі мяняліся, таксама гучанне гурту, асабліва ў 2005 г., калі таксама кавер у выкананні „Тіня Сонця" апынуўся на трыб'ют-альбоме „GODS TOWER". Гэта асабліва цікавае, таму што „Песні Гугайстра" запісаныя на беларускай мове, а як самі музыкі прызнаюцца, яна ім блізкая — амаль як родная.

„FARBEN LEHRE" — гурт заснаваны ў 1986 г. з патрэбы спявання „сапраўдных песень". Назоў узяўся з цыкла „Польскія кветкі" Юльяна Тувіма. Першы дыск „Без пакоры" з'явіўся ў 1991 г., але да гэтага моманту паспелі прайграць шмат канцэртаў, між іншым, у траўні 1988 г. у Беларусі. Іхняя музыка вельмі энергічная, меладычная, поўная радасці ад самой ігры і перад усім свабодная ад комплексаў. „Даступныя гукі ды жменя шчырых слоў з'яўляюцца спробай духовай сувязі з другім чалавекам"

„Раста" — гурт прэзентуе музыку, якую найчасцей называюць *modern synth metal*. Са сваім металёвым гучаннем напэўна будзе добра ўспрыняты публікай, хаця розныя музычныя сайты не шкадуюць ім слоў крытыкі. Гурт ужо вядомы польскім слухачам, дзякуючы многім канцэртам і добраму менеджменту.

„Крамбамбуля" — жыццярадасны музычны праект, асацыяваны перад усім з Лявонам і Ганнай Вольскімі. Музыкі гуляюць канвенцыямі, а эфектам іхняй працы з'яўляюцца вясёлыя песенькі на розныя нагоды, з застолля пачынаючы, а на Калядах ды іншых святах канчаючы. Апошняй ідэяй праекта з'яўляюцца віртуальныя паштоўкі аўтарства Міхала Анемпадыстава — сябра сёлетняга фестывальнага журы. „З днём Народзінаў" Басовішча!

Вяртанні

На сцэну ў Борыку вяртаюцца два характэрныя гурты. Пасля пяцігадовага перапынку будзем мець магчымасць паслухаць канцэрт гурту **„Палац"**. Магчыма, што паспяховы выступ „Тройцы" ў мінулым годзе прыпомніў нам час, калі побач панкаў і рок-менаў іграллі фольк-музыкі. „Палац" мае, аднак, сваю адметнасць, шмат гадоў працуе, аб'ядноўваючы фольк з электронікай і рытмамі *діско*, што, праўдападобна, пашырае кола аматараў музыкі гэтага гурту. Думаю, што варта чакаць гэтага канцэрта!

Таксама пару гадоў стаяў у чарзе гурт **„Зніч"**. За гэты час дарабіўся ён новага матэрыялу. Адно астаецца без змен — характар музыкі. „Зніч" заўсёды спалучаў цяжкую металёвую музыку з язычніцкімі ўплывамі на беларускую культуру. Цікавым напэўна будзе параўнанне падыходу да гэтага самага музычнага жанру з боку беларускага „Зніча" і ўкраінскага гурту „Тінь Сонця".

Як вядучы на сцэну „Басовішча" вяртаецца вядомы музыка, DJ, журналіст — **Аляксандр Памідораў.**